ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 99 (2048)
10 снежня 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Увагу ўсёй краіны прыцягвае цяпер работа сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР шостага склікання, якая адкрылася ў Маскве ў Крамлі 7 снежня. На парадку дня — тры пытанні:

1. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966 год.

2. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1966 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1964 год.

3. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

З дакладам па першаму пункту парадку дня выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, Старшыня Дзяржплана СССР М. К. Байбакоў.

— 1966 год мае для нас асаблівае значэнне — гэта першы год новай пяцігодкі, — гаворыць дакладчык. — Пачатак гэтага года азнаменуецца скліканнем XXIII з'езда нашай партыі, на якім будуць разгледжаны перспектывы развіцця Савецкага Саюза на надыходзячае пяцігоддзе. Будучы год з'яўляецца таксама годам пераходу да новых форм кіравання прамысловасцю, далейшага ажыццяўлення намечанай партыяй шырокай праграмы развіцця сельскай гаспадаркі і пачаткам укаранення мерапрыемстваў па ўзмацненню эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці.

Галоўнымі задачамі плана на 1966 год з'яўляецца забеспячэнне ўздыму сельскай гаспадаркі, пераважнае развіццё галін прамысловасці, якія забяспечваюць тэхнічны прагрэс і рост прадукцыйнасці працы ва ўсёй народнай гаспадарцы, хутчэйшае ўкараненне дасягненняў навукі і тэхнікі і далейшае павышэнне ўзроўню жыцця народа.

Дакладчык падрабязна спыняецца на пытаннях развіцця прамысловасці і транспарту, сельскай гаспадаркі, капітальнага будаўніцтва, на мерапрыемствах па павышэнню ўзроўню жыцця народа.

Гаворачы пра найбольш важныя пытанні развіцця народнай гаспадаркі саюзных рэспублік, дакладчык, у прыватнасці, адзначае, што ў Беларускай ССР вытворчасць прамысловай прадукцыі павялічыцца на 8,7 працэнта. Асабліва хуткімі тэмпамі намячаецца развіццё хімічнай прамысловасці і вытворчасці тавараў народнага ўжытку. Так, вытворчасць калійных угнаенняў узрасце амаль на 37 працэнтаў, хімічных валокнаў — на 34 працэнты, баваўняных тканін — у 2,9 раза, шаўковых тканін — на 68 працэнтаў, цэльнамалочнай прадукцыі — амаль на 11 працэнтаў.

З дакладам «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1966 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1964 год» выступіў міністр фінансаў СССР, дэпутат В. Ф. Гарбузаў.

Пасля даклада В. Ф. Гарбузава старшынствуючы зачытаў паступіўшыя ад груп дэпутатаў запытанні міністру замежных спраў СССР.

Адно з запытанняў датычыць ходу XX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН і разгляду на ёй прапаноў Савецкага Саюза аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі і неўмяшанні ва ўнутраныя справы дзяржаў.

Другая група дэпутатаў хацела б пачуць ад міністра ацэнку Савецкім урадам урадавай заявы канцлера Федэратыўнай Рэспублікі Германіі Л. Эрхарда і рэваншысцкай палітыкі ФРГ.

Шырокую ўвагу ў Савецкім Саюзе і за рубяжом прыцягнула да сябе падрыхтоўка да другой канферэнцыі краін Азіі і Афрыкі ў Алжыры. «Як абстаіць справа цяпер са скліканнем канферэнцыі і якія пазіцыі дзяржаў-удзельніц наконт запрашэння на гэту канферэнцыю Савецкага Саюза?» — пытаюцца ў міністра дэпутаты.

7 і 8 снежня на раздзельных пасяджэннях Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР абмяркоўваліся даклады М. К. Байбакова і В. Ф. Гарбузава.

9 снежня з вялікай прамовай — адказам на запытанні дэпутатаў на сесіі выступіў міністр замежных спраў СССР А. А. Грамыка.

У сувязі з тым, што Прэзідыум ЦК КПСС палічыў мэтазгодным, каб А. М. Шалепін сканцэнтраваў сваю дзейнасць, як сакратар ЦК КПСС, у Цэнтральным Камітэце партыі, Вярхоўны Савет СССР вызваліў А. М. Шалепіна ад абавязкаў намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР. Вярхоўны Савет СССР назначыў П. В. Каванава старшынёй Камітэта народнага кантролю СССР.

Дэпутаты абедзвюх палат раздзельным галасаваннем прынялі Закон аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966 год і Закон аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1966 год. Былі зацверджаны таксама Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, прынятыя ў перыяд пасля шостай сесіі.

9 снежня на вячэрнім пасяджэнні Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР горача сустрэты прысутнымі выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутат А. І. Мікаян. Ён звярнуўся з просьбай да Вярхоўнага Савета вызваліць яго ад абавязкаў Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Дэпутат Л. І. Брэжнеў ахарактарызаваў жыццёвы шлях А. І. Мікаяна, яго выдатныя заслугі перад партыяй і Савецкай дзяржавай, асабліва адзначыўшы работу на пасадзе Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Л. І. Брэжнеў прапанаваў выбраць А. І. Мікаяна членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. На пасаду Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Цэнтральны Камітэт партыі рэкамендуе таварыша М. В. Падгорнага.

Вярхоўны Савет СССР задаволіў просьбу А. І. Мікаяна вызваліць яго ад абавязкаў Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР выбраны М. В. Падгорны. А. І. Мікаяна Вярхоўны Савет выбраў членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

У сваёй кароткай прамове М. В. Падгорны падзякаваў дэпутатам за аказанае яму высокае давер'е. Ён заявіў, што аддасць усе свае сілы, веды справе будаўніцтва камунізма.

Сёмая сесія Вярхоўнага Савета СССР закончыла работу.

НАШ СУЧАСНІК



Аляксандр Васіленка, рэзьбашліфавальшчык Віцебскага станкабудаўнічага завода, — чалавек са сваім непаўторным абліччам. Але глядзіш на фотапартрэт і бачыш нешта ўвогуле характэрнае для нашага сучасніка. Гэта нібы сама рабочая маладосць з яе адкрытай чыстай душой, натхненнем, гатоўнасцю на подзвіг.

Аляксандр Васіленка на сваім заводзе адзін з лепшых рабочых, штомесяц выконвае план на 150—200 працэнтаў.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

ТЫСЯЧА РУКАПІСАЎ

Бібліятэка Беларускага аддзялення Музычнага фонду СССР — скарбніца рукапісных нот беларускіх кампазітараў. Тут захоўваецца каля тысячы твораў — песень, кантат, араторый, санат, інструментальных п'ес, сімфоній, опер.

Ноты не ляжаць на паліцах. Яны вельмі часта высылаюцца для выканання прафесіянальным і самадзейным калектывам рэспублікі. Бібліятэка атрымлівае пісьмы ад індывідуальных выканаўцаў, якія просяць даслаць песні і арыі з опер. У гэтым годзе высылаліся ноты ў Маскву, Кіеў, Рыгу, Горкі, Саратаў. Нядаўна была адпраўлена бандэроль у Англію. Туды, для аднаго з музычных калектываў выслалі канцэрт для скрыпкі з аркестрам Д. Камінскага і другую сімфонію Я. Глебава.

За апошні час бібліятэка значна папоўнілася новымі рукапісамі і нотамі беларускіх кампазітараў.

З БЛАКІТНЫХ ЭКРАНАЎ

На блакітных экранах Гомельшчыны ўсё часцей паказваюцца канцэрты беларускай музыкі, выступленні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, творчыя сустрэчы майстроў мастацтва БССР і самадзейных кампазітараў вобласці.

Асаблівай папулярнасцю ў тэлегледачоў карыстаецца новы цыкл перадач «Майстры мастацтва БССР». Гэтыя штомесячныя перадачы вядуцца сумесна з Саюзам кампазітараў Беларусі. Перад гомельскімі тэлегледачамі выступілі з расказам аб сваёй творчасці беларускія кампазітары Я. Цікоцкі, М. Аладаў, Д. Камінскі, Р. Бутвілоўскі, Ю. Семяняка, Э. Тырманд, М. Шнейдэрман і другія. У гэтых перадачах прымалі ўдзел канцэртныя брыгады майстроў мастацтваў БССР.

Студыя тэлебачання правяла тэлевізійны конкурс на лепшую песню аб Гомелі. Самадзейныя кампазітары вобласці прыслалі на конкурс 36 песень. Пераможцамі конкурсу аказаліся самадзейныя кампазітары М. Дзімант, І. Кіраўцаў, М. Шчарбакоў.

Рэдакцыя музычных перадач студыі атрымлівае шмат пісьмаў, у якіх тэлегледачы просяць перадаць новыя музычныя творы беларускіх кампазітараў. Іх просьбы і заяўкі рэгулярна выконваюцца.

СЕМІНАР САМАДЗЕЙНЫХ КАМПАЗІТАРАЎ

У нашай рэспубліцы працуе многа харавых калектываў. У рэпертуары амаль кожнага з іх ёсць творы самадзейных кампазітараў. Некаторыя песні аматараў сталі любімымі творамі моладзі. Найбольш папулярныя песні беларускіх самадзейных кампазітараў гучаць на эстрадных пляцоўках Літвы, Латвіі, Расійскай Федэрацыі.

З мэтай дапамогі самадзейным аўтарам рэспублікі Дом народнай творчасці днямі склікаў пяцідзённы семінар пачынаючых кампазітараў. На семінары будуць праслуханы і абмеркаваны новыя песні, наладжаны сустрэчы са старэйшымі кампазітарамі рэспублікі. Для ўдзельнікаў семінара будуць працытаны лекцыі «Дасягненні і задачы музычнага мастацтва», «Музыка як сродак эстэтычнага выхавання», «Асаблівасці песенных тэкстаў» і іншыя.

Запланавана некалькі канцэртаў, на якіх будуць выкананы творы самадзейных кампазітараў. Так у выкананні аматараў сцэны Палаца культуры Мінскага трактарнага завода прагучаць «Ручнікі» і «Прывітальная» М. Пятрэнкі, «Што ж ты мне сэрца параніў» І. Сушко, «Беларусь родная» А. Граса, творы А. Шыдлоўскага, М. Лісіцына, В. Гарбатоўскага і іншых.

У рабоце семінара прымае ўдзел звыш 30 самадзейных кампазітараў.

ВЫКОНВАЮЦЦА НОВЫЯ ТВОРЫ

Да пленума Саюза кампазітараў Дзяржаўны народны аркестр БССР падрыхтаваў праграму з твораў, якія напісаны для аркестра за апошнія два гады. Некаторыя з іх прагучаць упершыню. Гэта — уверцюра-скерца і тры танцы Я. Дзягцярыка, дзве песні Э. Тырманд, Беларуская сюіта А. Багатырова ў 4-х частках («Лірычнае інтэрмецца», «На возеры», «У палях», «У лесе» і «Вяселле»).

У ЖЫЦЦЁ — З ЭСТЭТЫЧНЫМ ІДЭАЛАМ

З ПЕРШАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЭСТЭТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ ШКОЛЬНІКАЎ

Днямі ў Мінску, у абласным Доме палітычнай асветы, сабралася з усёй рэспублікі некалькі сот чалавек — дырэктары школ, настаўнікі музыкі, малявання і літаратуры, работнікі аддзелаў народнай асветы, пазашкольных устаноў, дзіцячых бібліятэк, кіраўнікі мастацкіх гурткоў, пісьменнікі, мастакі, кампазітары, мастацтвазнаўцы, дзеячы кіно і тэатра, а таксама навукова-педагагічныя работнікі — як з Беларусі, так і з Масквы, Украіны, Літвы, Латвіі, Казахстана. На парадку дня гэтага форума — праблемы эстэтычнага выхавання ў школе.

Сёння эстэтычнае выхаванне моладзі — надзённая задача, «праблема нумар адзін», як адзінадушна прызналі ўдзельнікі канферэнцыі. Новы чалавек, які паводле вызначэння Праграмы партыі «павінен гарманічна спалучаць у сабе духоўнае багацце, маральную чысціню і фізічную дасканаласць», не можа быць сфарміраваны без добра наладжанага эстэтычнага выхавання. Не будзе перабольшаннем сказаць, што ад эстэтычнага выхавання залежыць, урэшце, і выхаванне адданасці камуністычным ідэалам.

Зусім натуральна, што канферэнцыя падкрэсліла асаблівую ролю настаўнікаў у справе эстэтычнага выхавання моладзі. Менавіта ад іх залежыць, выйдзе са сцен школы чалавек з тонкім адчуваннем сапраўднага хараства, з трапяткой багатай душой ці эмацыянальна глухім да ўсяго цудоўнага, са скажоным, грубым эстэтычным густам.

— Эстэтычнае выхаванне мае спецыфічны характар. Аднак яно не можа весціся на нейкіх спецыяльных уроках, за межамі разумовага і маральнага выхавання,— гаварыла, вызначаючы мэты і задачы эстэтычнага выхавання, намеснік дырэктара Навукова-даследчага інстытута мастацкага выхавання АПН РСФСР, кандыдат філасофскіх навук В. Апраксіна. — Інакш гэта будзе эстэцтвам, пры якім захапленне прыгожым ідзе не ад сэрца, а ад разумовых і маральных перакананняў.

Канферэнцыя невыпадкова шмат увагі аддала пытанням эстэтычнага выхавання ў пачатковай школе. Нішто так не ўзбагачае ўражлівую псіхіку дзяцей малодшага ўзросту, як вывучэнне і эстэтычнае ўспрыманне малюнкаў прыроды. Яе харастро выклікае ў душы чалавека, і асабліва дзіцяці, можа быць, больш глыбокія і пяшчотныя пачуцці, чым творы мастацтва, бо прырода дзейнічае на чалавека ўсёй гармоніяй колераў, гуку і паху. Гэта асабліва трэба ўлічваць на першай ступені эстэтычнага выхавання школьнікаў, гаварыў аспірант Мінскага педінстытута А. Самарцаў. Напісаны мастаком пейзаж толькі тады ўсхвалюе дзіця, калі выкліча ў яго асацыяцыі з непасрэдна знаёмай яму жывой прыроды. І наадварот, навязванне незнаёмых карцін зусім не садзейнічае развіццю эстэтычнага пачуцця дзіцяці, а тармозіць і прытупляе яго.

Педагогі гаварылі пра нізкі эстэтычны ўзровень у пачатковай школе ўрокаў спеваў і малявання, пра неабходнасць замяняць тут «універсальных» педагогаў спецыялістамі. У рэспубліцы зараз больш дзвюх тысяч пачатковых школ маюць патрэбу ў спецыялістах спеваў і малявання.

Ні з чым непараўнанае значэнне для эстэтычнага выхавання ўрокаў літаратуры. У канферэнцыі прыняло ўдзел шмат настаўнікаў-літаратараў, якія валодаюць вялікім уменнем выхоўваць любоў да твораў літаратуры і роднага слова.

Але часта яшчэ літаратура выкладаецца нудна, прымітыўна, калі ўрокі яе зусім не садзейнічаюць фарміраванню эстэтычных поглядаў. Мала чытаюць вучні па-за школьнай праграмай. Апытанне ў адной са школ выявіла, што больш 80 працэнтаў з іх ведаюць напамяць творы толькі са школьных хрэстаматый. Адбіраючы творы для пазакласнага чытання, настаўнікі, звычайна, абмяжоўваюцца утылітарным падыходам, кіруюцца перш за ўсё дыдактычным зместам таго ці іншага твора.

Аб выкладанні літаратуры заклапочана гаварылі навуковы супрацоўнік Інстытута мастацкага выхавання АПН РСФСР І. Далецкая, настаўнікі Е. Злотнікава, М. Карнієвіч, Е. Няронская, К. Лісоўская, Н. Парукаў і іншыя.

Ўшынскі неяк сказаў, што «чалавек больш чалавек у тым, як ён адчувае, чым у тым, як ён думае». Музыка закранае такія струны душы, да якіх часта не мае доступу слова. На жаль, частка нашай моладзі не ўспрымае так званую сур'ёзную музыку — тую музыку, якая найбольш выхоўвае пачуцці, эмацыянальныя якасці. Наглядаецца нездаровае захапленне рознымі нізкапробнымі джазамі, не лёгкай, як сказаў народны артыст СССР Р. Шырма, «а нейкай аблегчанай, рэстараннай музыкай».

Пэўную віну за пашырэнне такой музыкі можна ўскласці на радыё і тэлебачанне, на эстраду, якія не заўсёды дбаюць аб распаўсюджванні высокай музычнай культуры сярод моладзі, патураюць іншы раз нізкім эстэтычным густам.

З другога боку, попыт сярод учарашніх і сённяшніх школьнікаў на гэтую бяздумную «музыку» сведчыць, што школы яшчэ слаба клапоцяцца аб выхаванні высокіх музычных густаў у моладзі. Праўда, у гэтым напрамку цяпер робіцца больш, чым раней. У кожнай школе вызначыліся такія формы музычнага выхавання, як аркестры народных інструментаў, харавыя гурткі, паўсюдна ствараюцца клубы аматараў музыкі, музычныя лекторыі, набываюцца фонахрэстаматыі, наладжваюцца калектыўныя праслухоўванні канцэртаў з наступным абмеркаваннем іх. Трэба старанна сачыць за кожным музычным гукам у школе, прапагандуючы сапраўдную музыку, заўсёды помніць, што «калі заспявае школа, заспявае ўвесь народ» (Ушынскі).

Мастацтвазнаўца Л. Ауэрбах, кіраўнік Дзяржаўнай харавой капэлы БССР Р. Шырма і многія педагогі гаварылі, што, на жаль, не ўсе настаўнікі самі любяць і разумеюць сур'ёзную музыку, могуць ацаніць музычны твор. Аб гэтым сведчыла і запіска, дасланая адным з удзельнікаў канферэнцыі ў прэзідыум: «Ці трэба, — гаворыцца ў ёй, — у век трактараў і машын прапагандаваць народныя песні — спадарожнікі каня і сахі?».

Не ўсё добра і ў арганізацыі выхавання сродкамі выяўленчага мастацтва. Школьнікі атрымліваюць слабае ўяўленне аб жывапісе. Многія з прамоўцаў спасылаліся на станоўчы вопыт школ Прыбалтыкі, у якіх паўсюдна створаны гурткі малявання, уведзен курс гісторыі мастацтваў. Тыя ж звесткі, якія атрымліваюць пра гісторыю жывапісу, скульптуры і іншых відаў мастацтва вучні ў школах нашай рэспублікі, вельмі скупыя і некваліфікаваныя.

Карціны, што дэманструюцца на ўроках, часта разглядаюцца не як самастойныя творы мастацтва, а як ілюстрацыі да літаратурных твораў. А бываюць выпадкі, калі вучням паказваюць карціну, прапаноўваючы знайсці па ёй... прыслоўе і дзеясловы.

Інакш трэба зірнуць і на славутыя «малыя трацяякоўкі». Яны выконваюць сваю ролю, калі перыядычна мяняюцца, абнаўляюцца. А якая карысць ад рэпрадукцый, якія глядзяць на школьніка праз усе гады яго вучобы?

Прафанацыя, а не азнаямленне з тайнамі малюнка характэрны для ўрокаў малявання ў многіх пачатковых школах. Звыш 90 працэнтаў малюнкаў, заўважыў у сваім выступленні старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. Стальмашонак, выконваецца тут з дапамогай лінейкі. Дзеці, не адымаючы ад яе руку, малююць дом, цыркулем выводзяць слупы дыму. Настаўнікі часам і не ўяўляюць, што карыстацца лінейкай на ўроках малявання наогул нельга. Вучні шырока прымяняюць капірку і за перазнятыя малюнкі атрымліваюць станоўчыя адзнакі.

Недастаткова прывіваецца дзецям і любоў да фотамастацтва. Аб яго ролі ў эстэтычным выхаванні школьнікаў шмат гаварыў выкладчык Віцебскага педінстытута Я. Васіленка. На думку некаторых педагогаў, майстэрствам фатаграфіі дзеці могуць з поспехам авалодаць яшчэ ў дашкольных дзіцячых установах.

Шырокая размова зайшла на канферэнцыі пра школьны інтэр'ер. Яго трэба не афармляць, а вырашаць у садружнасці з архітэктарамі. Пара адмовіцца ад панелей, якія разрэзаюць школьныя сцены папаламі і ўскладняюць іх афармленне. Даўно ўжо вядуцца размовы пра стэндаманію, гаварыў Ул. Стальмашонак. А зайдзіце сёння як не ў кожную школу, і вы ўбачыце сцены і калідоры, загрувашчаныя ўсялякімі мёртвымі экспанатамі, паказной амуніцыяй нікому непатрэбных школьных куткоў, выпадковымі плакатамі, вітрынамі і пано, якія аж слепяць вочы чырвоным колерам. Рэдкі дырэктар школы сёння перакананы ў эстэтычным ды і выхаваўчым змесце гэтага «харастра», але ж... прывычка, традыцыя.

Школа павінна радаваць светлымі, строгімі, прыемнымі для вачэй танамі і колерамі, ствараць творчы настрой і адначасова падкрэсліваць велічную і сціплую святочнасць.

На канферэнцыі шмат гаварылася і пра эстэтычнае аблічча самога настаўніка. Гарачымі апладысментамі правялі з трыбуны настаўніцу сярэдняй школы № 35 г. Мінска Я. Перавозную, само выступленне якой прынесла прыступным у зале вялікую эстэтычную асалоду.

Перавозная, па сутнасці, правяла паказальны ўрок літаратуры з нябачнымі вучнямі, выявіўшы сапраўдную паэтычную адухоўленасць, здольнасць пераўвасабляцца. Кожнаму, хто слухаў яе, захацелася трапіць на яе сапраўдны ўрок, які яна вядзе па прынцыпу літаратурна-музычнай кампазіцыі.

— Такіх настаўнікаў, як Перавозная, у нас адзін на дзве тысячы, — сказаў хтосьці з удзельнікаў канферэнцыі. Можа ён і перабольшваў трохі, але не памыліўся ў асноўным: сярод нашых настаўнікаў шмат яшчэ людзей эстэтычна глухіх няздольных да глыбокага эмацыянальнага вытлумачэння твораў мастацтва.

Расказвалася ж на канферэнцыі пра дырэктара адной з мінскіх школ, які ў кніжным магазіне ўчыніў разнос яго работнікам за тое, што яны асмеліліся выставіць на вочы «Аголеную» Сярова: як бы гэта, маўляў, не запсавала школьнікаў, што заходзяць у магазін.

Канферэнцыя, безумоўна, прынесла вялікую карысць. Яна з'явілася першай спробай падагульніць і распаўсюдзіць лепшы вопыт эстэтычнага выхавання, ужо даволі багаты ў рэспубліцы, і даць настаўнікам некаторыя парады і рэкамендацыі. Гэтая гаворка яшчэ больш замацавала дружбу настаўнікаў з працаўнікамі літаратуры і мастацтва, яна будзе садзейнічаць аб'яднанню іх сіл у справе эстэтычнага выхавання моладзі.

ПРАЦЯГ РАЗМОВЫ

Саюз кампазітараў БССР запрасіў да сябе вялікую групу ўдзельнікаў Першай рэспубліканскай навуковай канферэнцыі па эстэтычным выхаванні школьнікаў. У клуб прыйшлі дырэктары школ, выкладчыкі літаратуры, музыкі і малявання, кіраўнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці. Тут адбыўся працяг размовы аб ролі музыкі ў эстэтычным выхаванні моладзі. У гутарцы прынялі ўдзел кампазітары Д. Камінскі, Я. Цікоцкі, Г. Вагнер. Затым адбыўся канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў.

ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ ТВОРЧАСЦІ

ГУТАРКА СА СТАРШЫНЁЙ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА КАМПАЗІТАРАЎ БССР Д. КАМІНСКІМ

Беларуская савецкая музыка за апошнія гады зрабіла значны крок наперад, прафесіянальна намнога пасталела. Яна заваёўвае ўсё большую папулярнасць і павагу ў масавага слухача не толькі нашай рэспублікі, але і суседніх братніх рэспублік, у многім дзякуючы радыёперадачам і гастрольным выступленням вядучых мастацкіх калектываў і салістаў Беларусі. У рады нашых творцаў музыкі ўліваюцца (хоць, трэба сказаць, і вельмі марудна) новыя таленавітыя аўтары, якія нясуць з сабой высокае творчае гарэнне, прагу пошукаў, імкненне ствараць новыя творы ў самых розных жанрах.

Сёння ў Мінску адкрываецца чарговы пленум Саюза кампазітараў БССР — своеасаблівы агляд беларускай прафесіянальнай музыкі, створанай у апошні час. Напярэдадні яго наш карэспандэнт сустрэўся са старшынёй праўлення саюза Дзмітрыем Раманавічам Камінскім і папрасіў расказаць пра тое, як будзе праходзіць гэты пленум.

— Нашы пленумы, — сказаў Д. Камінскі, — якія склікаюцца не радзей аднаго разу ў паўтара гады — гэта творчыя справаздачы майстроў старшага пакалення і кампазітарскай моладзі перад шырокай грамадскасцю. (Апошняя такая справаздача адбылася ў сакавіку леташняга года і была прысвечана сімфанічнаму і камернаму жанрам).

— Чым характэрны сёлетні пленум для беларускай кампазітарскай арганізацыі?

— Разам з усім савецкім народам работнікі мастацтва, у тым ліку і творцы музыкі пачалі рыхтавацца да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Гэты пленум не толькі падвядзе вынікі творчасці нашых кампазітараў за апошні час, але і здолее ў некаторай ступені вызначыць, што можна ўключыць з навінак беларускай музыкі ў праграмы будучых святочных канцэртаў, а над чым яшчэ варта настойліва папрацаваць.

— Які распарадак дня пленума? Якая яго праграма?

— У кампазітараў, як вядома, пленумы заўсёды праходзяць не так, як у іншых творчых саюзах. Адкрываюцца яны, як правіла, серыяй публічных канцэртаў. А потым усё, што на іх выконваецца, шырока, калектыўна абмяркоўваецца спецыялістамі-музыкантамі і радавымі слухачамі. Так будзе і на гэты раз: спачатку праслухоўванне музыкі, галоўным чынам, новай, раней невядомай, а пасля — яе абмеркаванне. Праграмай пленума прадугледжана шэсць вялікіх канцэртаў — два сімфанічныя, два камерныя, два зборныя.

— Раскажыце, калі ласка, што канкрэтна будзе ў іх выконвацца.

— Вось, напрыклад, сімфанічныя канцэрты (яны адбудуцца 10 і 12 снежня ў зале філармоніі). У першым з іх прагучаць: нядаўна публічна выкананы фартэпіянны канцэрт Г. Вагнера (саліст — лаўрэат Міжнароднага конкурсу В. Шацкі), зусім новая музычная карцінка з народнага жыцця Д. Смольскага, напісаная для струнных, баяна і труб; новы, толькі сёлета закончаны Канцэрт для голасу з сімфанічным аркестрам Я. Глебава (сола выканае народная артыстка СССР Н. Ткачэнка) і яго ж Трэцяя сімфонія (саліст — лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага Э. Міянсараў). Другі сімфанічны, за выключэннем абнародаванай у пачатку сезона Другой сімфоніі Л. Абеліёвіча, складаецца з адных музычных прэм'ер. Упершыню будуць выконвацца Уверцюра М. Аладава, прысвечаная 20-годдзю перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, Канцэрт для кантрабаса з аркестрам А. Багатырова (саліст Дзяржаркестра СССР Р. Азархін). Фартэпіянны канцэрт Р. Бутвілоўскага (салістка Л. Тэр-Мінасян).

— А што цікавага пачуюць слухачы з камернай і харавой музыкі?

— У праграму камерных вечароў уключаны таксама амаль усе новыя творы. Гэта — Другая саната для дзвюх скрыпак, віяланчэлі і фартэпіяна М. Аладава, Трэці струнны квартэт Д. Лукаса, Саната для флейты і арфы П. Падкавырава, цыкл фартэпіянных п'ес «Фрэскі» Л. Абеліёвіча, Саната для флейты з фартэпіяна Д. Смольскага, маё Фартэпіяннае трыо, вакальныя цыклы і рамансы С. Картэса, А. Янчанкі, Э. Тырманд і іншыя.

У сімфанічных і камерных канцэртах прымуць удзел Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР пад кіраўніцтвам В. Катаева, вядучыя салісты Мінска, а таксама Масквы. З новымі беларускімі песнямі, хорамі, народнай і эстраднай музыкай пазнаёмяць грамадскасць Акадэмічная харавая капэла БССР, Беларускі народны хор, Дзяржаўны народны аркестр БССР, хор і канцэртна-эстрадны аркестр радыё і тэлебачання.

— Да свайго пленума наша кампазітарская арганізацыя, — працягвае Д. Камінскі, — прыйшла не толькі з новымі буйнымі і невялікімі па форме творамі. (Трэба адразу сказаць, што ў нашай творчасці пераважае сімфанічны жанр і значна адстае оперны, мала пішацца харавых твораў). Мы можам пахваліцца і пэўнымі поспехамі ў культурна-асветнай рабоце, у эстэтычным выхаванні працоўных. Кампазітары і музыказнаўцы актыўна ўдзельнічаюць у творчых сустрэчах з працаўнікамі заводаў і калгасных палёў, з моладдзю (толькі сёлета такіх сустрэч адбылося 125), выязджаюць з лекцыямі-канцэртамі да воінаў пагранічных застаў. Музычнае выхаванне народа — наш прамы абавязак. Вось ужо другі год мы вядзём на Гомельскай тэлестудыі цыкл творчых сустрэч беларускіх кампазітараў з тэлегледачамі вобласці. Знаёмім іх з новымі творамі, з планамі на будучае.

Пленум закончыцца дыскусіяй па праслуханых творах. Спадзяёмся, што госці, запрошаныя з братніх рэспублік, і ўсе ўдзельнікі гэтага музычнага агляду не абмяжуюцца толькі абмеркаваннем таго, што было зроблена за апошні час, але і выкажуцца па нявырашаных праблемах, спыняцца на тых задачах, якія стаяць перад намі ў сувязі з падрыхтоўкай да нашага з'езда і святкавання 50-гадовага юбілею Вялікага Кастрычніка.



Паверхі «Нафтабуда».
Фота К. ЛАУРЭНЦЬЕВА.

Не ў многіх музычных школах вучаць дзяцей іграць на арфе. Гэты інструмент даволі складаны і не кожнаму дзіцяці пад сілу. І тым больш прыемна, што ў музычнай школе № 2, што на Мінскім аўтазаводзе, клас арфы існуе ўжо чацвёрты год. Наш фотакарэспандэнт Ул. Крук зрабіў гэты здымак у час заняткаў юнай арфісткі, вучаніцы 4-га класа Н. Пульянавай са сваім педагогам А. Мядзведзевай.

ПА КОЛАСАЎСКІХ МЯСЦІНАХ

Салдаты і сяржанты Н-скай часці Беларускай ваеннай акругі любяць паэзію Якуба Коласа. У бібліятэцы часці шмат кніг народнага паэта.

Па ініцыятыве групы воінаў салдаты і сяржанты зрабілі аўтобусную экскурсію па месцах, звязаных з жыццём і творчасцю песняра.

Удзельнікі экскурсіі пабывалі ў Стоўбцах, Акінчыцах, Альбуці, наведалі сярэднюю школу ў Мікалаеўшчыне і дом, у якім зараз жыве малодшы брат Коласа Іосіф Міхайлавіч. Ён расказаў экскурсантам аб жыцці і творчасці брата.

Па дарозе назад воіны пабывалі ў Доме-музеі пісьменніка.

У час экскурсіі ў воінаў з'явілася думка стварыць кінанарыс пра паэта, грамадскага дзеяча. Гэтую ідэю ажыццявіў адзін з удзельнікаў захапляючага падарожжа старшы лейтэнант В. Дронаў, які зняў фільм «У краі Якуба Коласа».

Я. МАЛЫ.

НА БЕЛАРУСКАЙ РАДЫЁХВАЛІ

Неўзабаве Беларускае радыё будзе адзначаць свой юбілей. Сорак год назад у эфіры прагучалі яго першыя перадачы, у якіх адно з галоўных месц займала беларуская народная і прафесіянальная музыка. Яшчэ ў 1927 годзе па нашаму радыё была выканана кантата М. Аладава «10 год», услед за ёю — «Сюіта на беларускія народныя тэмы» А. Рагоўскага, а ў наступныя гады — цэлы рад іншых твораў маладой беларускай музыкі.

З тых часоў творчыя калектывы і салісты радыё былі амаль заўсёды першымі выканаўцамі ўсяго новага, што выходзіла з-пад пяра майстроў музычнага мастацтва рэспублікі. Музычныя навінкі пастаянна папаўняюць нашу фондавую фанатэку. Цяпер, напэўна, і не пералічыць усяго, што змяшчаецца ў ёй. Толькі за апошнія гады творчыя калектывы Беларускага радыё запісалі на плёнку нямала оперных, вакальна-сімфанічных твораў нашых кампазітараў. Запісана таксама некалькі праграм беларускай эстраднай музыкі, якія былі прыхільна сустрэты шырокімі масамі радыёслухачоў.

Няспынна папаўняецца наша фанатэка і за кошт твораў, спецыяльна напісаных для радыё. Адным з піянераў у гэтай галіне быў старэйшы беларускі кампазітар М. Чуркін, які яшчэ ў 1941 годзе стварыў радыёоперу для дзяцей «Рукавічкі» на лібрэта Л. Варанковай (у перакладзе Э. Агняцвет). Набліжаецца да жанру дзіцячай оперы музыка Д. Лукаса, напісаная ім да радыёспектакля «Рак-вусач», многа цікавага ў яго музыцы да радыёпастановак «Казка пра цара Зубра», «Наш сусед Джані», «Пінская шляхта». Бясспрэчнымі мастацкімі вартасцямі вылучаецца музыка Л. Абеліёвіча да радыёспектакляў («Каштанка», «Пунсовыя ветразі», «Машанька і гарошына», «Сказ пра газ»), Г. Вагнера («Залаты восраў», «Багдан Хмяльніцкі», «Шакалы»), Я. Глебава («Сымон-музыка»), Ю. Семянякі («Зорачка»), Д. Смольскага («Чалавек з легенды»).

Сувязі Беларускага радыё з кампазітарамі рэспублікі не абмяжоўваюцца толькі заказамі на музыку да радыёспектакляў ці перадачамі ў эфір канцэртаў з іх твораў. Нярэдка нашы кампазітары выступаюць перад мікрафонам з расказам аб сваёй творчасці, з успамінамі аб гісторыі беларускай музыкі, разглядам асобных твораў, ці ў якасці выканаўцаў, аўтараў тэксту перадач, музычных радыёаглядальнікаў і г. д.

Стараючыся як мага шырэй прапагандаваць творчасць кампазітараў, музычная рэдакцыя наладжвае цыклы адкрытых канцэртаў беларускай музыкі, праводзіць канферэнцыі радыёслухачоў з паказам лепшых твораў нашых майстроў музычнага мастацтва на прамысловых прадпрыемствах і ў сельскіх мясцовасцях Беларусі. Дзякуючы радыё беларуская музыка выйшла далёка за межы рэспублікі і гучыць не толькі ў Савецкім Саюзе, але і ў многіх іншых краінах свету.

Можна яшчэ спаслацца на такія цыклы радыёперадач, як «Вечары беларускай музыкі», «Родныя напевы», «На музычных серадах» у Саюзе кампазітараў». Усе яны сведчаць пра тое, што паміж беларускай музыкай і нашым радыё здаўна існуюць творчыя сувязі. Аднак ці ўсё зроблена ў гэтым напрамку? Што перашкаджае наладзіць яшчэ больш цеснае і плённае супрацоўніцтва беларускіх аўтараў з рэдакцыяй музычнага вяшчання? Чаго чакаюць ад такога супрацоўніцтва радыёслухачы? Думаецца, усе гэтыя пытанні знойдуць нейкае адлюстраванне ў выступленнях удзельнікаў пленума Саюза кампазітараў БССР, які пачынаецца сёння.

Што, на маю думку, трэба палепшыць у рабоце радыё і Саюза кампазітараў па прапагандзе лепшых узораў нашай нацыянальнай музыкі? Нягледзячы на значную колькасць самых разнастайных перадач аб беларускай музыцы, у нас амаль адсутнічаюць такі папулярны, надзвычай цікавы жанр, як музычная радыёпастаноўка.

А між тым дзесяткі цікавейшых тэм з гісторыі беларускай музычнай культуры так і «просяцца» ў будучыя радыёпастаноўкі і радыёспектаклі. Мала ў нас музычных апавяданняў, навел, грашаць дрэннай літаратурнай мовай канцэрты-нарысы, перадачы аб кампазітарах, музычных калектывах, асобных спеваках і інструменталістах. Такое становішча склалася таму, што рэдакцыя музычнага вяшчання не мае добрага аўтарскага актыву. Пошукі шляхоў для яго павелічэння не спыняюцца, і тое-сёе ўжо зроблена. Так, летась на радыё праходзіла практыку група студэнтаў-музыказнаўцаў другога курса Беларускай кансерваторыі, і частка з іх досыць удала спрабуе цяпер свае сілы ў стварэнні музычных радыёперадач. У бягучым навучальным годзе практыку будуць праходзіць студэнты ўжо трох курсаў і гэта, відаць, дасць таксама станоўчыя вынікі. А вось члены музыказнаўчай секцыі Саюза кампазітараў яшчэ вельмі мала і неахвотна (за рэдкім выключэннем) выступаюць на радыё. А без іх дзейснай дапамогі ўзняць мастацкі ўзровень тэкставага матэрыялу музычных перадач даволі цяжка.

У Саюзе кампазітараў БССР не раз гаварылася пра перыядычнае выданне музычнага часопіса ці альманаха. Але ж кожны ведае, што для гэтага патрэбна паліграфічная база, пэўныя сродкі, спецыяльная рэдкалегія, а ўсё гэта не так лёгка арганізаваць. Таму калектыў нашай рэдакцыі дамовіўся з Саюзам кампазітараў праводзіць штомесячныя выступленні членаў творчай арганізацыі па радыё з самымі разнастайнымі матэрыяламі. Гэта маглі быць расказы пра творчыя задумы і планы асобных аўтараў, разгляд музыкі калегі па мастацтву, крытычныя выступленні і нават дыскусіі па найбольш кардынальных пытаннях развіцця беларускай музыкі. Адным словам, мелася на ўвазе адкрыць новы, цікавы радыёчасопіс — «Кампазітары перад мікрафонам». Першыя выпускі яго былі сапраўды досыць змястоўныя і выклікалі станоўчыя водгукі радыёслухачоў.

Аднак літаральна праз некалькі месяцаў запал нашых кампазітараў і музыказнаўцаў астыў. Выйшаўшы ў эфір усяго чатыры разы, цыкл гэты спыніў сваё існаванне.

Значнай папулярнасцю карыстаюцца выступленні нашых кампазітараў перад пачаткам выканання іх уласных партытур. З гэтых выступленняў радыёслухачы могуць даведацца аб гісторыі стварэння таго ці іншага музычнага твора, яго задуме, змесце, літаратурнай праграме, выяўленчых сродках, якія выкарыстаны аўтарам.

Усё гэта, безумоўна, цікава, але такія выступленні маюць і адну агульную хібу: у іх поўнасцю адсутнічае крытычны аналіз, і тут ужо радыёслухачы павінны кіравацца ўласным густам.

Запісваючы той ці іншы твор на магнітафонную стужку, пры сучасным тэхнічным узбраенні радыё можна дасягнуць вельмі цікавых і нечаканых эфектаў. Напрыклад, падключыўшы «пакой рэха», можна стварыць уражанне гучання ў бясконцай «касмічнай» прасторы. Або карыстаючыся «падвойным запісам», калі адна з груп аркестра робіць фанаграму якога-небудзь музычнага твора, на яе «накладвае» тую ж самую мелодыю, можна дабіцца яркага і моцнага гучання якое ў шмат разоў перавышае сапраўдныя выканаўчыя магчымасці гэтай аркестравай групы ці ўсяго аркестра.

Усе гэтыя музычныя эфекты, удала выкарыстаныя ў партытуры, маглі б дапамагчы кампазітару стварыць прынцыпова новыя гучанні, рухаць музыку наперад. Чаму б нашым кампазітарам не паспрабаваць напісаць спецыяльныя «радыёоперы», «радыёкантаты», «радыёсімфоніі»?

Беларускае радыё мае ў сваім складзе канцэртна-эстрадны аркестр, хор, секстэт домр, салістаў. Усе яны з любоўю ставяцца да творчасці беларускіх кампазітараў, заўсёды з нецярплівасцю чакаюць новых твораў. Майстры ж беларускай музыкі не вельмі спяшаюцца задаволіць нашы чаканні. У эстрадным жанры ўвогуле актыўна працуюць не больш двух-трох прафесіянальных аўтараў і значную колькасць музыкі для эстраднага аркестра «пастаўляюць» аматары.

У апошнія гады эстрадныя музычныя жанры набылі незвычайную папулярнасць, тысячы пісьмаў нашых радыёслухачоў патрабуюць пашыраць іх месца ў музычным вяшчанні. Разам з тым некаторая частка моладзі захапляецца заходнім камерцыйным джазам, які толькі псуе густы і калечыць душы маладых людзей. Вось чаму нашым кампазітарам неабходна супрацьпаставіць заходнім музычным плыням сваю цікавую музыку.

І яшчэ пра адну важную праблему беларускай музыкі таворыць амаль кожнае трэцяе пісьмо радыёслухачоў. Гутарка ідзе пра масавую песню. Неяк так здарылася, што ў апошнія гады вядучае месца ў песенным жанры заняла лірычная песня. І гэта лірыка, шчыра кажучы, вельмі далёкая ад сапраўднага мастацтва. Як грыбы пасля цёплага дажджу, з'яўляюцца ў нас цягучыя, нудныя песні аб нераздзеленым каханні, ашуканых надзеях, неадбыўшыхся сустрэчах, занадта сарамлівых хлопцах, што ніяк не адважацца прызнацца дзяўчыне ў каханні і г. д. і да т. п. Слухаеш усю гэту, з дазволу сказаць, «эстэтычную прадукцыю» і дзіву даешся!

З прагнасцю чакаюць радыёслухачы звонкіх, жыццярадасных, вясёлых песень, такіх жа ўзнёслых, няўрымслівых, імклівых, як і ўсё наша сённяшняе жыццё. Чакаюць новых опер аб сваіх сучасніках, савецкай моладзі, новых кантат і сімфоній, а разам з гэтым і яркіх дасціпных аркестравых мініяцюр, змястоўнай эстраднай музыкі, па-сапраўднаму мастацкіх п'ес для джаза.

Для вас, таварышы кампазітары, дзверы Беларускага радыё заўсёды шырока расчынены! Часцей карыстайцеся яго мікрафонамі, каб яшчэ паўней задавальняць культурныя запатрабаванні народа, яго музычныя густы!

Дзмітрый ЖУРАЎЛЁЎ,
галоўны рэдактар музычнага вяшчання Беларускага радыё.

ВЫСТАЎКА ТВОРАЎ АРХІТЭКТАРАЎ

У памяшканні Гомельскага аблпраекта адкрыта выстаўка мастацкіх твораў мясцовых архітэктараў. Тут экспануюцца шматлікія карціны, партрэты, малюнкі архітэктурных помнікаў Беларусі і Украіны.

Вялікае месца ў зале займаюць пейзажы роднага краю, выкананыя архітэктарамі А. Мяленцьевым і А. Кудзіненка. Наведвальнікі пазнаюць цудоўныя куткі гарадскога парку культуры і адпачынку імя Луначарскага, месцы адпачынку гамяльчан каля паўнаводнага Сожа. Шмат часу аддае жывапісу галоўны архітэктар аблпраекта К. Усцюгаў. За апошнія гады ён стварыў цікавыя карціны. Многія з іх дэманструюцца на выстаўцы.

Свае творы прадставілі на выстаўку архітэктары Л. Патапаў. Ш. Хінчын і іншыя мастакі-аматары.

Ф. ЗАЯЦАЎ.

У БУДУЧЫХ ДОЙЛІДАЎ

Група студэнтаў-выпускнікоў архітэктурнага аддзялення будаўнічага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута працуе па заданню Дзяржбуда БССР над праектам забудовы новага паўднёва-заходняга жылога раёна г. Мінска (у раёне Курасоўшчыны). Тут будзе жыць каля 40 тысяч чалавек, для іх будуць створаны ўсе культурна-бытавыя выгоды. Новы жылы масіў уключыць у сябе некалькі мікраёнаў, якія будуць мець добрую сувязь з горадам.

Над гэтым праектам зараз працуюць студэнты Мікалай Гардзіенка, Іван Галушка, Уладзімір Залеўскі, Валянцін Кашырын, Аркадзь Карабкоў, Марк Рабіновіч і Мікалай Шуміхін. Кіруюць імі дацэнты В. Анікін, Л. Мацкевіч, Н. Трахтэнберг.

С. ДУБРОВА.

АГІТТЭАТР «УСМЕШКА»

Першы спектакль «Смяяцца, сапраўды, не грэх» самадзейнага агітпаэтра «Усмешка», створанага пры Доме культуры Магілёўскага завода штучнага валакна імя Куйбышава, прайшоў з вялікім поспехам.

Спектакль паставіў дырэктар абласнога Дома народнай творчасці В. Бараноўскі. Балетмайстар — кіраўнік народнага ансамбля танца М. Кіракозаў, мастацкі афарміцель — выкладчык культасветвучылішча В. Акулаў.

БЕЛТА.

ВЕДЫ ЦІ ДЫПЛОМ?

Артыкул М. Цікоцкага «Веды ці дыплом!» — працяг гаворкі аб універсітэцкай падрыхтоўцы журналістаў. Гаворку гэтую пачаў на старонках нашай газеты студэнт аддзялення журналістыкі БДУ А. Белавусаў. Яго артыкул «Дыплом журналіста» быў змешчан 19 лістапада г. г.

Пытанні падрыхтоўкі журналістаў у апошнія гады не раз узнімаліся на старонках друку. Былі выказаны розныя думкі і прапановы, аднак большасць удзельнікаў дыскусіі пагадзілася на тым, што універсітэцкая, у прыватнасці, філалагічная падрыхтоўка журналістаў самая мэтазгодная. Яна найбольш адпавядае спецыфіцы журналісцкай работы як работы літаратурнай. І гэта, відаць, правільна.

Задача, такім чынам, заключаецца ў тым, каб удасканальваць гэтую сістэму ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца сёння да работнікаў друку. І, у першую чаргу, неабходна пазбавіцца ад шкалярства і дагматызму ў навучанні, зрабіць яго па-сапраўднаму жывым і творчым працэсам. Аб гэтым зусім слушна гаварыў С. Палякоў у артыкуле «Багаж у вялікую дарогу». (Гл. «Літаратуру і мастацтва» за 30 лістапада г. г.).

Аддзяленне журналістыкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце існуе ўжо больш як 20 гадоў. Сярод яго выпускнікоў мы бачым цяпер вядомых журналістаў і пісьменнікаў, партыйных работнікаў і навуковых супрацоўнікаў. Усе яны ў той ці іншай меры абавязаны універсітэту, які даў ім пэўныя веды і ўказаў правільны напрамак жыцця. Натуральна, што многія з іх адчуваюць пэўную незадаволенасць пройдзеным курсам журналістыкі. Паўтараю, натуральна, таму што няма і не будзе ніколі такой дасканалай праграмы навучання, якая прадугледжвала б усе магчымыя пытанні, што паставіць наша шматгранная рэчаіснасць перад будучым журналістам.

Любая праграма, любы курс навук закладвае толькі асновы, на базе якіх можна потым, у адпаведнасці з талентам і адукацыяй, рашаць разнастайныя творчыя задачы. Гэта не азначае, аднак, што праграмы па курсу журналістыкі бездакорныя ва ўсіх адносінах. Безумоўна, яны патрабуюць удасканалення і паляпшэння. Неабходна, напрыклад, надаваць больш увагі спецыяльным курсам і семінарам па праблемах журналісцкага майстэрства, мовы і стылю, кінарэпартажу і тэлебачання, канкрэтнай эканомікі і публіцыстыкі і г. д. Але як можна глыбока і ўсебадымна вывучыць усе гэтыя і іншыя пытанні, калі паводле новага плана тэрмін навучання на аддзяленні журналістыкі зведзены да чатырох гадоў? Калі ўлічыць, што амаль палову гэтага тэрміну студэнты праводзяць на практыцы, дык на тое, каб «набіваць галаву», застаецца сапраўды нямнога часу. Таму вельмі важна рацыянальна і плённа пражыць студэнцкія гады, каб потым не было крыўдна за марна патрачаны час. А калі каму і прыйдзецца нанава чытаць Леніна, Горкага, Арыстафана, Талстога, Герцэна і інш.,— то гэта ж спрадвечны лёс творчых натур, якія вучацца ўсё сваё жыццё, а не толькі пяць гадоў ва універсітэце. З адным універсітэцкім багажом прайсці ўсю вялікую дарогу жыцця сур'ёзнаму чалавеку немагчыма.

Праўда, ёсць у нас, на жаль, і такія студэнты, якія цалкам задаволены праграмай навучання і былі б вельмі не супраць, каб яе скарацілі яшчэ удвая — абы атрымаць дыплом! Сярод гэтай часткі студэнтаў існуе часта утылітарны, чыста прагматычны падыход да універсітэцкай адукацыі. Яны лічаць, што сапраўднаму журналісту патрэбна галоўным чынам пэўная сума практычных навыкаў. Што датычыцца такіх дысцыплін, як гісторыя філасофіі, гістарычная граматыка, логіка, псіхалогія і інш., то ці варта імі забіваць галаву, бо ў практычнай дзейнасці яны як быццам не спатрэбяцца. Прыходзіцца канстатаваць, што ў гэтай няправільнай, вельмі шкоднай думцы іх падтрымліваюць і некаторыя практычныя работнікі рэдакцый.

Так, сапраўды, для таго, каб напісаць заметку пра даярку або пра тое, што калгасны клуб увесь час на замку, не трэба ніякай універсітэцкай адукацыі. Але каб напісаць глыбокі публіцыстычны, літаратурна-крытычны або прапагандысцкі артыкул, у якіх адчуваюць пастаянную патрэбу рэдакцыі газет, трэба ўмець мысліць шырока і творча, а гэтаму якраз і вучаць многія «непрафілюючыя» дысцыпліны, да якіх так пагардліва ставяцца некаторыя студэнты. Паспрабаваць загадзя вырашыць, што табе спатрэбіцца ў жыцці а што не — гэта значыць свядома абмяжоўваць кола сваіх духоўных інтарэсаў, абкрадваць сябе. Універсітэт павінен навучаць высокаму і сур'ёзнаму погляду на жыццё, а не таму, як зарабіць пэўную суму грошай. Цікава, што іменна на такую, часта утылітарную аснову пастаўлена падрыхтоўка журналістаў у ЗША. Вось перада мною падручнік «Сучасны журналізм», выпушчаны ў 1962 г. універсітэтам штата Індыяна. У ім чорным па беламу напісана, што галоўная задача журналіста — умець прадаць тавар або ідэю. І тут жа ўказана, колькі можна зарабіць грошай. Ці не ў гэтым бачаць некаторыя прыхільнікі «заходняга вопыту» ўзор для пераймання?

У апошні час гавораць аб спецыялізацыі журналістаў. Выказваюцца нават думкі аб тым, што журналіст павінен быць спецыялістам у той ці іншай галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і г. д. Мне думаецца, што такі погляд на праблему сучаснай журналістыкі вельмі аднабаковы. Журналіст — гэта, у першую чаргу, грамадскі дзеяч і літаратар. Яму не абавязкова разбірацца ў самых тэхнічных вытворчасці або навукі на ўзроўні інжынера, агранома або ўрача. Сфера яго інтарэсаў — не «чыстая» вытворчасць, а, у першую чаргу, узаемаадносіны людзей у працэсе вытворчасці, г. зн. — этычны бок праблемы. І аб гэтым ён павінен умець напісаць лепш за інжынера, агранома або ўрача. Адсюль важнае месца ў падрыхтоўцы журналістаў павінна займаць праблема літаратурнага майстэрства ва ўсёй яе складанасці і разнастайнасці. С. Палякоў мае рацыю, калі гаворыць, што журналістыка — гэта ў першую чаргу таксама чалавеказнаўства.

Між тым многія, нават вопытныя журналісты, лічаць, што для журналіста галоўнае ведаць эканоміку і своечасова адгукнуцца на актуальныя падзеі часу. Што датычыцца літаратурнага майстэрства і нават элементарнай пісьменнасці — то гэта, маўляў, справа стылістаў і карэктараў. Вось характэрны прыклад. Студэнт К. праходзіў практыку ў сельскагаспадарчым аддзеле газеты «Гродзенская праўда». Ён друкаваўся даволі часта, але яго матэрыялы з літаратурнага боку былі проста бездапаможныя... Нягледзячы на гэта рэдакцыя ў характарыстыцы, выдадзенай студэнту, прапанавала ацаніць яго практыку на «выдатна».

Ніколі не трэба забываць, што культурны і эстэтычны ўзровень нашага чытача штогод павышаецца, і яго не задавальняюць ужо прымітыўныя ў літаратурных адносінах журналісцкія опусы, нават калі яны злабадзённыя.

Тут мы падыходзім да самага балючага пытання, якое даўно непакоіць нас,— да праблемы набору на аддзяленне журналістыкі. Згодна з існуючымі правіламі прыёму, на факультэты і аддзяленні журналістыкі прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы (любой!) не менш двух гадоў і маюць здольнасці да літаратурнай дзейнасці. Якім жа чынам правяраецца гэтая «здольнасць да літаратурнай дзейнасці»? На падставе праверкі агульных для ўсіх са ўненняў школьнага тыпу і экзамену ў аб'ёме школьнай праграмы.

Мне думаецца, што настаў час карэнным чынам змяніць характар уступных экзаменаў на аддзяленне журналістыкі. Трэба, каб маладыя людзі, што паступаюць ва універсітэт, пісалі сачыненні сапраўды творчага характару. Каб тэмы сачыненняў не былі абмежаваны «вобразам Пяорына» або «вобразам Анегіна». Каб па гэтай першай самастойнай пісьмовай рабоце ў сценах універсітэта можна было б меркаваць аб шырыні творчага мыслення, эрудыцыі і нарэшце, аб разумовых здольнасцях будучага студэнта, аб яго патэнцыяльных здольнасцях да працы ў той прафесіі, якую ён сабе абраў.

Уступны экзамен павінен быць творчым, такім, як у мастацкіх вышэйшых навучальных установах: кансерваторыі, літаратурным або тэатральна-мастацкім інстытутах. Экзамены павінны прымаць прафесары і вядучыя выкладчыкі або нават камісія з прадстаўнікоў друку і пісьменнікаў. Нельга не згадзіцца з думкай, выказанай выкладчыкам факультэта журналістыкі Маскоўскага універсітэта А. Калініным на старонках «Неделі». У правілах прыёму сказана, што абітурыента трэба апытваць «у аб'ёме сярэдняй школы». Пры такіх умовах прымаюць нават здаўшага на «тройку», г. зн. не «дацягнуўшага» да «аб'ёму», бо ўвесь «аб'ём» вызначаецца, відаць, «пяцёркай». І атрымліваецца, што універсітэту даводзіцца «дацягваць» новаспечанага студэнта да школьнай праграмы. Відаць, на ўступных экзаменах трэба пытаць больш, чым у «аб'ёме» (і ўзаконіць гэта). Тады мы і атрымаем сапраўды аб'ём. Пры гэтым ацэнку трэба выводзіць не толькі з адказу на пытанне білета і на дадатковыя пытанні, але і па выніках абмену думкамі з паступаючым адносна прадмета экзамену, а мо нават шырэй, — адносна прадмета журналісцкай працы наогул.

Мне думаецца, што не трэба гнацца за вялікім працэнтам першакурснікаў з вытворчым вопытам «дзеля стажу». Добра падрыхтаваны школьнік прынясе з сабою ва універсітэт свежыя веды і пэўную звычку вучыцца. Бывае, што сапраўды таленавітаму школьніку адмаўляюць у прыёме толькі таму, што ў яго няма пэўнага вытворчага стажу. На яго ж месца залічваюць такога «стажніка», які нават і не ўяўляе сабе, што гэта за прафесія «журналіст». Я згодны з А. Калініным і ў тым, што гадоў сем-восем назад, калі пры залічэнні ва універсітэт улічваліся ў першую чаргу веды, паказаныя на ўступных экзаменах, агульны ўзровень груп і курсаў быў вышэйшы.

Вось тыя некалькі пытанняў, якія хацелася ўзняць у сувязі з выступленнямі А. Белавусава і С. Палякова. Трэба адзначыць, яшчэ, што журналісцкія кафедры нашага універсітэта імкнуцца падтрымліваць пастаянны кантакт з творчымі работнікамі рэдакцый газет, радыё і тэлебачання. Многія з вядучых журналістаў Мінска запрашаюцца для правядзення заняткаў па тых ці іншых раздзелах праграмы, дапамагаюць выпускнікам у працы над дыпломнымі сачыненнямі. Такую творчую сувязь з практычнымі работнікамі друку, радыё і тэлебачання трэба пашыраць і ўмацоўваць. Значна горш у нас справа з абсталяваннем кабінетаў і лабараторый аддзялення журналістыкі. У нас, па сутнасці, да гэтага часу няма ні сапраўднай фота-кіналабараторыі, ні кабінетаў тэхнікі газетнай справы, радыё і тэлебачання. Хацелася, каб у гэтых адносінах і рэктарат, і Міністэрства вышэйшай адукацыі, і Саюз журналістаў аказвалі нам больш дзейсную дапамогу.

М. ЦІКОЦКІ,
дацэнт, в. а. заг. кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ імя Ул. І. Леніна.

РЭПАРТАЖ СА ЗДЫМАЧНАЙ ПЛЯЦОЎКІ

ДВА КАДРЫ

Некалькі крокаў па звычайнай з дошак падлозе калідора, адчыняеце звычайныя дзверы, над якімі табло: «Ціха—здымка!», два крокі за парог — і вы заміраеце ад здзіўлення. Вы высока ў гарах. Скалістыя вяршыні, пакрытыя снегам, бяскрайняе неба, воблакі, камяністае плато. Тыповая для высакагорнага пейзажу шызаватая дымка. Сон, казка? Не, гэта звычайная работа мастака. На кінастудыі «Беларусьфільм» ідуць здымкі апошніх кадраў новага мастацкага фільма «Альпійская балада». Здымачны калектыў з упэўненай дзелавітасцю творыць на здымачнай пляцоўцы цуды — з вынаходніцтвам, фантазіяй, выкарыстоўваючы сучасныя дасягненні навукі і тэхнікі. Прыкладна па такой схеме. Звяртаецца рэжысёр-пастаноўшчык фільма Барыс Сцяпанаў да мастака Кубарава:

— Слава, патрэбны горы.

— Добра, будуць горы...

— Вяршыня — вышыня трыццаць тысячы.

— Добра, будзе вяршыня...

— Неба і воблакі...

— Будзе неба і будуць воблакі...

Потым зварот да піратэхніка Дабрэнкі:

— Міхась, патрэбен вецер, туманная дымка і пазёмка.

— Што ж!—трэба — значыць будзе. І вецер будзе, і дымка, і пазёмка.

І вось яны стаяць, горныя вяршыні, пабліскваючы белізною снежных шапак, усыпаныя валунамі, ахутаныя лёгкім туманам. У павільёне паўзмрок—гарыць адна дзяжурная лямпачка. Але...

— Няхай будзе святло!

Праўда, каманда падаецца больш лаканічна і з меншым пафасам — рэжысёр паварочваецца да дзяўчыны ў белым халаце, якая штосьці калдуе ля невялікага пульта, і гаворыць: «Соня, святло». Соня Лук'янчык націскае адну кнопку, другую, трэцюю і зверху на горныя вяршыні выліваецца водаспад яркіх пражэктарных праменняў... Снег пачынае іскрыцца, неба асвятлілася морам святла. Адчуванне павільёна, памяшкання знікае, і нават той факт, што спіна адчувае цяпло батарэі цэнтральнага ацяплення, зусім не зніжае ўражання.

І раптам:

— Маторы!..

Узялі з месца вентылятары — ірве вецер адзенне на акцёры. Акцёру, які стаіць у струмені магутнага паветранага патоку, даводзіцца нагінацца ў бок ветру, каб устаяць на нагах, з вачэй цякуць слёзы...

— Дым давай!.. Чаму няма дыму?—стараючыся перакрыкваць шум вентылятараў, гукае рэжысёр.

Міхась Дабрэнка, які ўтульна прымасціўся на корабе вентылятара, падносіць запалку да парашка, насыпанага на фанерцы, парашок пачынае дымиіца. Вентылятар падхопліваe космы дыму і кідае іх на акцёра... З вялікай хуткасцю праносяцца міма акцёра белыя клубы дыму, якія нават зараз успрымаюцца як клубы снегу...

І ўсё-такі галоўнае — вочы акцёра. Яны становяцца гнеўныя, трывожныя—няма таго спакойнага чалавека, які толькі што стаяў побач са мною і мірна рабіў практыкаванні фізічнай зарадкі... Узнік чалавек у адзенні вязня канцэнтрацыйнага лагера, у твары сіла волі, усведамленне смяртэльнай небяспекі... Вочы яго глядзяць уніз на падлогу, а ў твар яму нацэлены аб'ектыў камеры. Ён камусьці крычыць:

— Здымай куртку!.. Здымай!..

Жэст, якім суправаджаецца крык, гаворыць аб тым, што сітуацыя настолькі напружаная, што можа адбыцца нават забойства, калі куртка не будзе знята...

На экране будзе толькі твар акцёра — здымаецца буйны план — уся ўвага гледача будзе на гэтых гнеўных вачах...

І раптам:

— Стоп!..

Заціхаюць маторы, гасне святло, няма загнанага смяртэльнай небяспекай вязня... Гэта ўжо не Іван з «Альпійскай балады» Васіля Быкава. Гэта Станіслаў Любшын, які спецыяльна, каб было больш натуральна, адгадаваў бараду. Станіслаў Любшын здымаецца ў другім фільме па сцэнарыі В. Быкава — першым быў фільм «Трэцяя ракета», у якім акцёр іграў ролю Лазняка. Рэжысёр падыходзіць да Любшына, яны абменьваюцца кароткімі рэплікамі. Затым каманда рэжысёра:

— Увага, здымаем другі дубль!..

Каманда рэжысёра здаецца дзіўнай — хіба можна зноў узнавіць тое, што было мінуту назад, хіба можа чалавек двойчы перажыць тое, што ён перажыў?

Аказалася, можа... Кадр быў сыграны і зняты не толькі другі, але і трэці, і пяты, і шосты раз, і ў кожным дублі ўсё было сапраўдным: і гнеў, і слёзы, і небяспека...

Не верыцца, што мінула некалькі гадзін. Усё было аддадзена адному кадру, які прамільгне на экране максімум за дзесяць секунд.

Другая палавіна дня пайшла на здымку другога кадра, у якім дзейнічаюць двое — Станіслаў Любшын і Люба Румянцава, якая іграе італьянскую дзяўчыну Джулію.

Аказваецца, гэта складана— падбегчы да замярзаючай дзяўчыны-вязня, якая ляжыць на каменях, накрыць яе курткаю, узваліць сабе на плечы і пранесці дваццаць пяць крокаў! Ірве, збівае з ног вецер, слепяць пражэктары—а ў кадры з дапамогаю ветафільтраў камера стварае ноч. Дым есць вочы, ужо ўвесь павільён патануў у густым дыме, а аператар, ўсё мала—давай дыму яшчэ. У Любшына падгінаюцца ногі пад цяжарам дзяўчыны, босыя ногі, абкручаныя анучамі, спатыкаюцца аб каменні (каменні пад нагамі самыя сапраўдныя). І трэба не проста працягнуць чалавека на сабе дваццаць пяць метраў — трэба сыграць, дакладна пралічыць усе крокі, не забыць зрабіць першы пававарот, другі, не аступіцца, каб не выйсці з кадра, і захаваць яшчэ мноства ўмоў. Восем дубляў і пяць-шэсць рэпетыцый — увогуле акцёр пранёс актрысу на плячах па камяністым схіле метраў трыста...

Не лёгка даецца праўда жыцця на экране.

Г. СЦЯФАНСКІ.

Рабочы момант здымкі фільма «Альпійская балада». Злева направа — С. Любшын (Іван), Л. Румянцава (Джулія) і рэжысёр Б. Сцяпанаў.

ПЕСНЯ Ў СПАДЧЫНУ

...Жыў у вёсцы каваль Мікалай Андронаў. Ён быў чалавекам працавітым. Сілаю і спрытам мог паспрачацца з любым у наваколлі. Работа ў яго, як кажуць, у руках гарэла. Любілі Мікалая людзі за кемлівасць ды нораў вясёлы, а яшчэ за песні. Цудоўны голас быў у каваля. Як заспявае, бывала, — заслухаешся!..

Вырас старэйшы сын Васіль. І ўвесь у бацьку пайшоў. Такі ж рослы, стройны. Толькі больш палюбіўся яму баян. Затое малодшы, Пецька, песні як і бацька, вельмі любіў.

Пеця часта бываў у кузні. Дадому яны ішлі разам. Бацька ступаў вялікімі крокамі, а калі сын стамляўся, каваль звычайна прапаноўваў:

— А ну давай паспяваем...

І плыла песня, узлятала ў яркую сінечу неба. Уторыў хлапечы галасок моцнаму голасу бацькі.

...Не стаў Пётр, як бацька, кавалём. Быў спачатку слесарам-мантажнікам. І калі бачыў плён працы сваёй, спявала яго душа. Спяваў і ён сам. Песня трывала ўвайшла ў яго жыццё. Удзельнічаў Андронаў у канцэртах самадзейнасці на будоўлі, потым у ансамблі Беларускай ваеннай акругі, калі служыў у арміі.

Шчаслівая зорка, як лічыць хлопец, прывяла яго на Мінскі аўтамабільны завод. Гэта ж так цудоўна — ствараць сваімі рукамі магутныя машыны! Праца тут, як песня. Амаль два гады назад прыйшоў ён на завод. У сталеліцейным цэху № 2 з'явіўся новы электраваршчык, а ў мужчынскім хоры заводскага інтэрната яшчэ адзін саліст.

Вельмі спадабаўся кіраўніку хору Мікалаю Андрэевічу Ільічову голас Андронава, а яшчэ больш яго захапленне песняю, стараннасць і выключная працавітасць. І на чарговым заводскім агляндзе самадзейнасці Пётр ужо выступаў як саліст.

Удзел у хоры прыносіць Андронаву вялікую радасць. Песня яму ў поўным сэнсе слова «будаваць і жыць памагае». Ей ён аддае ўвесь свой вольны час, хоць, шчыра кажучы, яго ў хлопца не вельмі многа. Сёлета Андронаў скончыў школу рабочай моладзі, атрымаў атэстат сталасці. Было цяжка яшчэ і таму, што, апроч усяго, Пётр Андронаў — сакратар камсамольскага бюро цэха — завадатар і пачынальнік многіх цікавых спраў вялікага камсамольскага калектыву.

Між іншым, Пётр Андронаў спявае ў цэху не адзін. Заспявалі і яго таварышы-камсамольцы — стварылі ў цэху свой мужчынскі хор. І заспявалі так, што на заводскім агляндзе мастацкай самадзейнасці цэхавы хор быў удастоены дыплома.

А хутка прыйшла і яшчэ адна радасць. Мужчынскаму хору інтэрната № 1, у якім паранейшаму спявае Андронаў, прысвоена ганаровае званне «Народны хор». Групе салістаў, у тым ліку Пятру Андронаву, прысвоілі званне «Артыст народнага хору».

Ёсць у Пятра Андронава свая мара. Думае ён паступіць у кансерваторыю. А на заводзе будзе працаваць паранейшаму. Вельмі прывязаўся ён да аўтамабільнага, шчыра пасябраваў з хлопцамі са свайго цэха, са свайго інтэрната. Яшчэ мацней палюбіў ён песні, якія дасталіся яму ў спадч

ТАК ПОЎНІЛІСЯ РЭКІ

«Новая зямля»... «Сымон-музыка»... Да гэтых магутных светлых рэк, што ўжо больш як трыццаць год жывяць акіян паэзіі, прыходзілі, прыходзяць і бясконца доўга будуць прыходзіць удзячныя чытачы, каб прычасціцца з іх светлых хваляў, наталіць смагу. І, напэўна, стоячы на запаветным беразе, не адзін задумваўся: чаму не мялеюць гэтыя рэкі? Дзе іх пачатак? Што іх жывіць?

На некаторыя з гэтых пытанняў мы можам атрымаць адказы, дзякуючы працы М. Мушынскага «Ад задумы да здзяйснення». Аўтар упершыню ў нашым літаратуразнаўстве на багатым фактычным матэрыяле разглядае творчую гісторыю лепшых паэм Якуба Коласа. Разглядае... А за гэтым словам — і працяглыя, не заўсёды плённыя пошукі ў архівах, і корпанне ў розных бібліяграфічных матэрыялах, і руплівая, разлічаная на аматара-падзвіжніка, тэксталагічная праца...

М. Мушынскі прасачыў гісторыю стварэння «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» ад іх першых радкоў, ад невыразнай першапачатковай ідэі, ад той іскры, з якой пачалося высокае полымя паэтычнага натхнення. Добра, што аўтар кнігі не загразе ў матэрыяле голых тэксталагічных параўнанняў, што за асобнымі фактамі ён здолеў убачыць агульны напрамак ідэйных і мастацкіх шуканняў паэта, іх гістарычную перспектыву. Ды і самі гэтыя факты далёка не абмяжоўваюцца названымі творамі. Так, М. Мушынскі, разглядаючы вытокі «Новай зямлі», падрабязна аналізуе лірыку і вершаваныя апавяданні паэта, якія храналагічна і ідэйна-тэматычна былі падрыхтоўчым этапам пры нараджэнні твораў. Наогул даследчык ніколі не выпускае з поля зроку ўсю творчую і грамадскую дзейнасць народнага паэта Беларусі, факты яго біяграфіі. Гэта, у прыватнасці, і дапамагло правільна вырашыць пытанне, звязанае з псіхалогіяй творчасці.

Як вядома, Якуб Колас напісаў асобныя раздзелы «Новай зямлі» яшчэ ў Мінскім астрозе, у 1911 годзе. Літаратуразнаўца зусім слушна піша, вызначаючы эмацыянальна-псіхалагічныя прадумовы нараджэння твора: «Чым больш прыгняталі вязня халодныя сцены турэмнай камеры, тым прыгажэйшымі здаваліся яму наднёманскія лугі і лясы, якія, нібы жывыя, паўставалі ў яго ўяўленні. Дарагія ўспаміны гасілі боль душы адарванага ад родных палеткаў песняра».

Аўтар кнігі на шматлікіх прыкладах даказаў (менавіта даказаў, а не толькі паказаў!), як з пашырэннем кругагляду, са зрухамі ў светапоглядзе Якуба Коласа, што былі выкліканы зменамі ў сацыяльным ладзе краіны, пашыраліся і змяняліся абсягі ідэйнага поля твораў. Як з лёгкага гумарыстычнага «расказа» «Як дзядзька ездзіў у Вільню і што ён там бачыў» вырасла энцыклапедыя жыцця дарэвалюцыйнага беларускага грамадства, а з некалькіх раздзелаў вершаванай аповесці «Казкі жыцця» — выдатная рамантычная паэма пра лёс і прызначэнне мастака і мастацтва «Сымон-музыка».

М. Мушынскі не абыходзіць увагай і працы Коласа па ўдаскана л е н н ю паэтычнага радка, і нядобразычлівай, тэндэнцыйна - павярхоўнай крытыкі твораў некаторымі вульгарнымі сацыёлагамі, якія лічылі, у прыватнасці, што асноўная ідэя «Новай зямлі»—гэта «стварэнне заможных хутарскіх гаспадарак». Толькі вось чамусьці даследчык ні разу не называе прозвішчы тых, каго крытыкуе. Не сакрэт жа, што і сярод вульгарных сацыёлагаў былі людзі розныя. Для адных сацыялагізатарскія хітраспляценні былі хлебам надзённым, другія трапілі ў гэтыя цянёты па прастаце душэўнай, трэція — паддаўшыся «модзе». І дачыцць творчую гісторыю лепшых здабыткаў нацыянальнай літаратуры, відавочна, трэба было з большай рашучасцю выказаць свае адносіны да тых, хто ў гэтай гісторыі адыграў незайздросную ролю.

Чытаючы ў працы М. Мушынскага пра тое, з якой любоўю вынашваўся ў сэрцы паэта літаральна кожны радок «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі», з горыччу прыгадваем, што шматлікі рускі чытач сапраўднага аблічча нашай класікі пакуль што яшчэ не ведае. «Купюры, зробленыя пры перакладзе алегорый, няўважлівасць да жанрава-стылявой асаблівасці рамантычнай паэмы, з яе сімвалічнасцю, асацыятыўнасцю, фальклорна-казачнай вобразнасцю— усё гэта прывяло да таго, што мастацкая непаўторнасць паэмы і філасофская глыбіня яе ідэі перадаюцца ў перакладзе не поўнасцю», — да такой думкі прыйшоў М. Мушынскі яшчэ раней у адным са сваіх артыкулаў пра рускі тэкст «Сымона-музыкі». У перакладзе ж «Новай зямлі» (Мінск, 1949 г.) гэтыя купюры нават больш значныя. І рабіліся яны часта таму, што, як пісаў сам Якуб Колас у лісце да рускага перакладчыка Я. Мазалькова ад 25.XI.1948 г., у перакладзе «асобныя мясціны былі не зусім удалыя, а зрабіць іх лепш не ўдавалася». Аднак была і іншая прычына. Вульгарны сацыялагізм яшчэ і пасля вайны быў надзвычай моцны. Менавіта таму Якуб Колас у час аўтарызацыі перакладу «Новай зямлі» на рускую мову вырашыў «у адпаведным месцы закінуць сумненне ў сэрца Міхала — ці сапраўды «свая» зямля дасць поўнае шчасце, ці не парушыць яго гэты пануючы сацыяльны парадак, дзе на першых скрыпках граюць паны і чыноўнікі». Устаўка гэта, якая «не парушыла ўсёй будовы паэмы і яе сэнсу», патрэбна была для таго, «каб не было прыдзірак з боку крытыкаў, якім часта трэба адна толькі дубінка... каб па прыватнаму выпадку ахаяць усю паэму» (Ліст Я. Коласа да Я. Мазалькова ад 6. VII. 1948 г.). Паэт ведаў, што рабіў, бо сімволіка асобных мясцін паэмы, не лішне аптымістычныя некаторыя філасофскія развагі давалі колькі хочаш повадаў для такой «дубінкі».

Такім чынам, апошняя кропка ў працы над «Новай зямлёй» была пастаўлена ажно ў 1948 годзе. На жаль, М. Мушынскі пакідае гэтую «кропку» па-за ўвагай. І, магчыма, па сваёй ранейшай неахвоце ўступаць у палеміку з прадстаўнікамі вульгарнага сацыялагізму. А добрая, вострая палемічнасць ніколі не шкодзіла навуковай працы...

У беларускім літаратуразнаўстве выказваліся два асноўныя погляды на жанравую прыналежнасць «Новай зямлі». Яшчэ з часу апублікавання твора большасць крытыкаў і літаратуразнаўцаў лічыць яго паэмай. (Зрэшты, так назваў твор і сам аўтар). Не так даўно А. Адамовіч глянуў на яго як на вершаваны раман. М. Мушынскі бачыць у «Новай зямлі» і адзнакі паэмы і шматлікія прыкметы рамана ў вершах, з паспешнай лёгкасцю даводзячы, што «пісьменнік імкнуўся... да гарманічнага спалучэння ў адных і тых жа раздзелах» паэмнага і раманічнага пачатку.

Нам, аднак, здаецца, што, маючы рацыю ў большай альбо меншай ступені, усе гэтыя выказванні крыху хварэюць на аднабаковасць. Яны не ўлічваюць у дастатковай ступені дыялектыку традыцый і наватарства і яе канкрэтнага праламлення ў творчасці аднаго з буйнейшых сусветных паэтаў — Якуба Коласа.

Яшчэ ў сярэдзіне 20-х гадоў праф. І. Замоцін заўважыў у «Новай зямлі» і «эпічны спакой Калевалы, апісуючай да маленькіх падрабязкаў стары народны лад, а часамі нават і непасрэднасць успрымання жыцця і прыроды, дасягнутую, напрыклад, «Песняю аб Гайяваце» Лангфела» («Якуб Колас у літаратурнай крытыцы». Мінск, 1926, стар. 60). Сучасны літаратуразнаўца А. Лойка, развіваючы далей гэтыя думкі І. Замоціна, нават адзін з раздзелаў сваёй кнігі пра эпахальны твор беларускай літаратуры назваў «Новая зямля» як эпас» (гл. А. Лойка. «Новая зямля» Якуба Коласа». Мінск, 1961). Аднак і І. Замоцін, і пазнейшыя даследчыкі выкарыстоўваюць тэрмін «эпас» пераважна як метафару, як сінонім да ідэйнага багацця твора, да шырыні ахопу падзей, да глыбіні раскрыцця ў ім народнага светаадчування і светаразумення.

Трэба, аднак, памятаць, што беларускі эпас з'явіўся тады, калі не толькі народна-міфалагічнае светаразуменне антычнасці, але і абмежаванасць светапогляду сярэдневякоўя былі далёка ззаду. Ён узнік у той час, калі жанры паэмы і рамана былі ўжо добра распрацаваны ў суседніх літаратурах — рускай, польскай, украінскай. Таму, захоўваючы, хоць і ў значнай трансфармацыі, асноўныя якасці класічнага эпасу (яго «ўсеахопны» характар, так званы тыпізаваны этнаграфізм; «эпічны спакой»; пераход паэтызацыі ў гераізацыю і ідэалізацыю), ён многае ўзяў і ад новай паэмы (багаты лірычны струмень; пафас услаўлення) і ад рамана (сацыяльная характарыстыка адлюстроўваемага; глыбіня псіхааналізу і індывідуалізацыі; некаторыя сродкі і спосабы тыпізацыі). Разам з тым, гэта не эпігонскае паўтарэнне ўжо пройдзенага ў іншых літаратурах, не эклектычнае спалучэнне ўласцівасцей розных жанраў — узнікла якасна новая літаратурная форма. І яе творцам стаў Якуб Колас — глыбокі і мудры наватар, галоўнымі клопатамі якога былі клопаты роднай зямлі і роднай літаратуры.

Канчаючы гутарку пра грунтоўнае і патрэбнае даследаванне М. Мушынскага, некалькі слоў хочацца сказаць і пра мову кнігі. Яна амаль усюды па-навуковаму выразная, ясная, часамі хораша прасвечваецца з яе яркі эмацыянальны струмень. Вось толькі аўтар яўна злоўжывае так званым «абканнем»: «аб буйных творах»; «сярод твораў аб паэце»; «аб пярэдадні рэвалюцыі»; «аб будучым ураджаі»; «аб аповесці і паэме» і г. д. Няцяжка ўбачыць, наколькі прыгажэй і натуральней загучалі б фразы, калі б ужыць тут беларускі прыназоўнік **пра**. Трэба заўсёды памятаць, што барацьба за культуру мовы—наша агульная задача: і шырокай грамадскасці, і пісьменнікаў, і літаратуразнаўцаў.

В. РАГОЙША.

М. Мушынскі. «Ад задумы да здзяйснення». Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск. 1965.

КАБ САПРАЎДЫ-НАСЦЕЖ!

У мінулым годзе — у сувязі з 20-годдзем перамогі — выйшла паўторным выданнем даўняя кніга вершаў А. Астрэйкі «Слуцкі пояс», якая ўпершыню была надрукавана ў 1943 годзе ў падпольнай партызанскай друкарні і якую А. Вялюгін некалі назваў «лірычным толам».

І вось на стале ў нас чарговая кніга паэта—«Сэрца насцеж», выдадзеная ў гэтым годзе. Шмат у чым змянілася зямля, «народжаная перамогай», змяніўся і паэт. Іншыя—цяпер ужо мірныя — тэмы і матывы сталі гучаць у яго песнях.

Мы не выпадкова называем вершы А. Астрэйкі песнямі: народнапесенная аснова яго творчасці — відавочная. Аб гэтым сведчаць не толькі такія традыцыйна-фальклорныя элементы яго паэтыкі, як «ласкавае сонца», «маладая вясна», «светлы май», «прамяністая вясёлка», «бярэзінка ля дуба, крынічанька ў бары», параўнанні «сталасць, як поўдзень, старасць, як вечар» і г. д., але і своеасаблівасць яго паэтычнага характару, адзначанага пэўнай неканкрэтнасцю і «безасабістасцю» лірычнага светаадчування. (Пра адсутнасць індывідуальнага псіхалагізму ў лірычных перажываннях паэта мы ўжо не гаворым).

Паэтычны свет А. Астрэйкі здаецца нам часам занадта ўтульным, песенна-лагодным, а ў паасобных вершах ён нават нагадвае безгустоўна намаляваную тэатральную дэкарацыю, дзе герою застаецца толькі адно—грэцца ля «кастра ўспамінаў», сузіраць «веснавую красу» і слухаць салаўіныя песні.

Неканкрэтнасць і «безасабістасць», нятворча запазычаныя з фальклорнай паэтыкі, перашкаджаюць паэту плённа ўжывацца ў сённяшнюю рэчаіснасць, угадваць яе зрухі.

Практыка сведчыць, што сучасная паэзія глыбокіх думак і пачуццяў магчыма і на народнапесенній аснове (П. Броўка, Р. Гамзатаў і інш.). Для гэтага паэту патрэбна, як правіла, высокая развітасць асабістага пачатку, які дазваляе яму паглыбляцца ў самыя разнастайныя з'явы рэчаіснасці. Якраз гэтай пранікнёнай асабістасці бракуе на наш погляд, сённяшнім вершам А. Астрэйкі І гэта іх галоўны недахоп.

Быў жа час (аб гэтым мы гаварылі), калі паэта нельга было папракнуць у нясмеласці або слабасці асабістага, суб'ектыўнага— у добрым і правільным разуменні гэтага слова—падыходу да жыцця. Грамадзянскі пафас паэта як ваяўнічага гуманіста найбольш поўна і шчыра выявіўся ў «Слуцкім поясе», у вершах, звязаных з ваеннай тэмаю, якія адносяцца да таго перыяду. Адтуль, відавочна, і бярэ пачатак тое лепшае, што ёсць у сённяшняга А. Астрэйкі, што ў апошнім зборніку аб'яднана цыклам «З партызанскага сшытка». Амаль пад кожным вершам гэтага цыкла, які кранае і хвалюе шчырасцю і мужнасцю, стаіць месца і час напісання: «Партызанская брыгада Шашуры, 1943», «Партызанская брыгада Яроменкі. Случчына, 1943», «Партызанскі эскадрон Гарбачова, 1943», «Партызанскі атрад Р. Курмялёва, Віцебшчына, 1942» і інш.

Галоўнае месца ў сённяшняй творчасці А. Астрэйкі складаюць матывы прыроды, апісанні вясенніх і асенніх пейзажаў, садоў і палеткаў, вячэрніх зор і начлежных кастроў. Зрэшты, цікавасць яго да свету прыроды можна зразумець:

Пасля былых цяжкіх дарог,
Крывавых бітваў і паходаў,
Да кроплі ў сэрцы я збяром
Любоў да хараства прыроды.
(«Прыйшоў вясенні неспакой...»)

Што ж датычыцца, так сказаць, чалавечага зместу сённяшніх пераўтварэнняў у прыродзе, а, галоўнае, у нашым грамадстве, то яны пакуль што, трэба прызнаць, застаюцца па-за межамі творчых інтарэсаў паэта. Сваю пэўную нецікавасць да сучаснага чалавека паэт міжвольна імкнецца нават нейкім чынам абгрунтаваць: чалавек, на думку паэта, «не змяняе колеру»:

Ён вясну прымае, славіць
восень,
Бо вясна і лета песцяць поле.
Восень у засекі збожжа носіць.
А што холад з поўначы
нахлыне,
Не бяда—у хату не залезе.
Чалавеку люба ўсё ў краіне—
Колаў скрып і скрып саней па
снезе.
(«Чалавек не змяняе колеру»).

Падобная спрошчанасць і пэўны прымітывізм у разуменні сучаснага чалавека адбіваюцца на паэтычных вобразах А. Астрэйкі, уключаючы сюды і залішнюю ідэальнасць цэнтральнага вобраза—вобраза лірычнага героя, які стараецца заўважыць толькі «хараство»: «от жыць як добра на зямлі, ніколі паміраць не трэба».

Зборнік вершаў «Сэрца насцеж» дае, такім чынам, матэрыял для разважанняў аб творчай пазіцыі сучаснага паэта, якая сёння павінна быць асабліва актыўнай, надзённай і, падкрэсліваем, асабістай. Гэтых рыс, на жаль, нестае паэзіі А. Астрэйкі. Адзначаны недахоп не можа кампенсаваць нават паэтычным майстэрствам, якім у пэўнай ступені валодае паэт. Трапляюцца ж у яго вершах і ўдалыя тропы, і свежыя метафары, і цікавыя, пластычныя вобразы («а ў небе зоркі, што цвікі, набіты ў сіняй столі густа. Як парсюкі, каля ракі бялеюць качаны капусты»),—але яны не могуць замяніць таго даследальніцкага пачатку, які ўласцівы творчай пазіцыі сучаснага мастака, імкнення ўдумацца ў жыццё, прааналізаваць з'яву.

Ул. ГНІЛАМЁДАЎ.

Анатоль Астрэйка. «Сэрца насцеж». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1965.

Працоўныя Полацка ахвотна заходзяць у кніжны магазін «Светач». Тут заўсёды можна набыць новыя творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў. Наш пазаштатны фотакарэспандэнт К. Лаўрэнцьеў зрабіў здымак у зале магазіна.

БІБЛІЯТЭКА СЯЛА ВЕРАСНІЦЫ

Гордасцю вёскі Верасніцы на Гомельшчыне стала бібліятэка. Тут рэгулярна праводзяцца канферэнцыі чытачоў, выпускаюцца вусныя часопісы, арганізуюцца вечары адпачынку, віншаванні перадавікоў. Пятнаццаць гадоў бібліятэкай нязменна кіруе Анастасія Адамаўна Канапліцкая. Савет бібліятэкі абмяркоўвае планы, розныя мерапрыемствы і ажыццяўляе іх.

Бібліятэка жыва адклікаецца на ўсе падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне, актыўна прапагандуе гістарычныя рашэнні партыі і ўрада. Толькі закончыў сваю работу сакавіцкі Пленум ЦК КПСС, як у Верасніцах усіх захапіла канферэнцыя чытачоў, у якой прыняла ўдзел больш чым чатырыста членаў сельгасарцелі імя Жданава. Даклад старшыні калгаса М. Якубоўскага аб развіцці сельскай гаспадаркі ў краіне горача абмяркоўвалі. Прымусіў падумаць аб вялікім будучым Радзімы, аб перспектывах яе развіцця і аб задачах, якія паўсталі перад кожным хлебаробам, афармлены культасветработнікамі стэнд «Рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС—у жыццё». Запомніліся вераснянцам і вечары «Сельсавет ад выбараў да выбараў», «Ленін і цяпер жывейшы за ўсіх жывых», «У чым прыгажосць чалавека», гутаркі з моладдзю аб літаратуры, музыцы і мастацтве.

Бібліятэка таксама актыўна прапагандуе цяпер рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

Актыў бібліятэкі заняты цяпер падрыхтоўкай тэматычнага вечара «Наш калгас ад XXII да XXIII з'езда КПСС». Стараюцца зрабіць яго змястоўным і цікавым.

Тут заўсёды ў курсе ўсіх навінак у навуцы, літаратуры і робяць усё, каб аператыўна інфармаваць аб гэтым сваіх чытачоў. Маляўнічыя стэнды «Хімія—ударны фронт сямігодкі», «Мы будзем жыць пры камунізме», рэкамендацыйныя спіскі літаратуры заўсёды прыцягваюць ўвагу вяскоўцаў.

Вераснянская бібліятэка, першая ў Жыткавіцкім раёне, дабілася таго, што яе кніга прыйшла ў кожны калгасны двор. За дасягнутыя поспехі культасветустанове прысвоена званне бібліятэкі выдатнай работы.

БЕЛТА.

СУСТРЭЧЫ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

Цэлы тыдзень гасцямі Віцебска былі пісьменнікі Мікола Ткачоў і Сцяпан Гаўрусёў. Яны выступілі перад рабочымі дывановага камбіната, станкабудаўнічага завода імя Кірава, тэкстыльнай фабрыкі «КІМ», перад слухачамі народных універсітэтаў культуры. Мікола Ткачоў прачытаў даклады «Вялікі Кастрычнік у беларускай літаратуры», «Сучасная беларуская літаратура», Сцяпан Гаўрусёў пазнаёміў чытачоў са сваімі новымі вершамі.

Пісьменнікі наведалі таксама Полацк. Гасцей слухалі студэнты нафтавага і педагагічнага тэхнікумаў, маладыя будаўнікі Нафтаграда, рабочыя завода шкловалакна.

А. ШПАК.



Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Народная асвета»: «Разгром» А. Фадзеева, «Зосіна зорачка» Я. Бяганскай, «Блакітны факел» Т. Цулукідзе, «Сшытак у чорнай вокладзе» Г. Шыловіча, «Зорачка-пяцёрачка» Хв. Жычкі, «Шэсць кароткіх гісторый» Я. Курто.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Дзмітрый Бугаёў. Уладзімір Дубоўка. Крытыка-біяграфічны нарыс. Мастак В. Жыжэнка. 1965 г. Тыраж 3 600 экз., стар. 184. Цана 34 кап.

Ганна Мушынская-Гофман. Вера і яе таварышы. Аповесць. Для старэйшага ўзросту. Прысвечана падпольнай дзейнасці Веры Харужай у 1925—1928 гадах. Пераклад з польскай мовы Я. Бяганскай. Мастак Г. Скамарохаў. 1965 г. Тыраж 5 600 экз., стар. 160. Цана 32 кап.

А. Бахоры. Абавязак таварыша. Апавяданні. Для сярэдняга ўзросту. Аб сябрах у далёкім Таджыкістане. Пераклад на беларускую мову М. Ваданосава. Мастак М. Бельскі. 1965 г. Тыраж 3 400 экз., стар. 72. Цана 9 кап.

Паўлюк Прануза. Дзе вясны пачатак. Вершы. Для малодшага ўзросту. Мастак І. Карпіновіч. 1965 г. Тыраж 3 500 экз., стар. 40. Цана 4 кап.

Іван Новікаў. Руіны страляюць ва ўпор. Дакументальная аповесць. На рускай мове. Аўтарызаваны пераклад з беларускай мовы Я. Мазалькова. Мастак П. Драчоў. 1965 г. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 464. Цана 87 кап.

Ніна Галіноўская. Лясная зарадка. Вершы. Для дашкольнага ўзросту. Мастак Ул. Лось. 1965 г. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 24. Цана 5 кап.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Паважаны таварыш рэдактар!

Прашу надрукаваць у газеце наступнае.

Чытачы Рэспубліканскай бібліятэкі імя Леніна вылучылі мой раман «Сэрца на далоні» на атрыманне прэміі імя Якуба Коласа. Некаторыя другія арганізацыі і чытачы падтрымліваюць гэтае вылучэнне. Я шчыра дзякую ўсім ім за высокую ацэнку майго твора.

Але я ўжо маю прэмію імя Якуба Коласа за раман «Крыніцы». Лічу нясціплым пратэндаваць на тую ж самую прэмію ў другі раз. Год, за які будуць прысуджацца прэміі, надзвычай ураджайны на творы добрыя, цікавыя, вартыя высокай адзнакі, і ў журы хопіць работы, каб выбраць найлепшыя з іх.

Прашу журы зняць раман «Сэрца на далоні» з конкурсу на прысуджэнне прэміі імя Якуба Коласа.

Іван ШАМЯКІН.

Заўвагі на палях

КАМУ ТРЭБА ПАДУМАЦЬ?

Прачытаў я ў Кобрынскай раённай газеце «Камуністычная праца» верш Васіля Рамашкі «Падумайце, хлопчыкі...» Прачытаў — і, як кажуць, вачам сваім не паверыў: няўжо яшчэ можа такое быць, каб падобная лухта друкавалася!..

Пачынаецца верш так:

Шкада мне модных
«хлопчыкаў»,
Што днямі блукаюць у скверы...
У хлопчыкаў шыі нябрытыя
І твары ў заўтра без веры.

Як можна меркаваць па гэтых радках, аўтар мае даволі цьмянае ўяўленне аб правілах вершаскладання. Ва ўсякім разе, запомніў ён, відаць, толькі тое, што ў вершах сказы пішуцца ў слупок. Магчыма, краем вуха чуў ён і аб тым, што вершам патрэбны рыфма і рытм. Затое аб тым, што перш чым пачаць спрабаваць пісаць вершы, трэба засвоіць правілы граматыкі роднай мовы, ён, відаць, і краем вуха не чуў. У выніку з-пад яго пяра выйшла вось што:

Аб чым яны думаюць днямі?
Якія сны сняцца начамі?
Адны косяць у бок растаравана,
Ды толькі адна вось загана:
Няма ў іх тугога кармана.
Другія глядзяць у вітрыны
Універмага і магазінаў.
Вось толькі пужаюць
хлопчыкаў
Там кветкі сігнальных
дроцікаў.
Нямала іх поглядаў юрких
Блукае па стройных фігурках
І толькі ўслед ножкам
прыгожым
У раскрытых ртах тухнуць
акуркі.

Пасля гэтага аўтар паставіў тры зорачкі і працягвае:

Вядуць карабліі іх равеснікі.
Імкнуцца да дальніх планетаў!
А вы дзе сляды пакінулі—
На сценах хіба туалетаў?

Каментары, як кажуць, тут не патрэбны.

Васіль Рамашка мог, дапусцім, напісаць і горшае глупства, але якім чынам яго «туалетная лірыка» трапіла на старонкі друкаванага органа?

У канцы верша аўтар глыбакадумна заўважае:

Падумайце, хлопчыкі ў
скверы,
Аб будучым дзён сваіх шэрых.

Мне ж здаецца, што падумаць трэба было і супрацоўнікам газеты, якія блаславілі ў свет гэты гібрыд непісьменнасці і пошласці.

Р. БАКІЕВІЧ, журналіст.

г. Бяроза.

Слова бярэ чытач

ГЕРОІ АЛЕРОНА

Гэтая невялікая кніжка, выпушчаная выдавецтвам «Беларусь»,— калектыўная праца літаратараў, якія жывуць у розных месцах: Леанід Прокша — у Мінску, Вадзім Андрэеў, сын вядомага рускага пісьменніка Леаніда Андрэева, — у Жэневе, Уладзімір Сасінскі — у Маскве. Кніга «Героі Алерона» ўваскрашае яшчэ адну старонку слаўнай барацьбы савецкіх людзей з гітлераўскімі захопнікамі.

В. Андрэеў і Ул. Сасінскі ў гады другой сусветнай вайны знаходзіліся на востраве Алерон, што ў Біскайскім заліве. Беларускага камсамольца Уладзіміра Антоненку гітлераўцы прывезлі на Алерон з Мазыра.

Востраў Алерон быў ператворан фашыстамі ў непрыступную крэпасць з мноствам артылерыйскіх батарэй і розных умацаванняў. Верачы ў непрыступнасць вострава, гітлераўцы амаль не думалі пра тое, што ваеннапалонныя, якія знаходзяцца на востраве, могуць аб'яднацца і весці падпольную работу. Савецкія ж людзі, як толькі апынуліся разам, адразу пачалі па магчымасці сваіх сіл шкодзіць гітлераўцам.

Душою антыфашысцкага падполля на востраве Алерон стаў беларускі хлопец, камсамолец з сяла Данілаўка Ельскага раёна Уладзімір Антоненка. Разам з ім у атрад, які налічваў 35 чалавек, уваходзілі Я. Краснапёраў, М. Яршоў, А. Коселеў і іншыя воіны Савецкай Арміі. Атрад падпольшчыкаў уваходзіў у склад 158-га пяхотнага палка французскіх узброеных сіл Супраціўлення.

Пра кіраўніка атрада Уладзіміра Антоненку расказвае Ул. Сасінскі ў нарысе «Хлопец з Мазыра». На аснове дакументальных матэрыялаў і ўласных уражанняў ён паказвае станаўленне простага беларускага юнака, які стаў душою атрада Супраціўлення на Алероне, падрабязна расказвае пра баявую дзейнасць падпольшчыкаў.

Асабліва падрабязна пра Уладзіміра Антоненку расказвае Леанід Прокша ў сваіх нарысах—«Ля вытокаў подзвігу» і «Сябры ўспамінаюць». Да таго, як апынуцца на далёкім французскім востраве, Уладзімір ужо нямала паваяваў у партызанскім атрадзе на Мазыршчыне.

Уладзімір і яго таварышы па падпольным атрадзе адыгралі немалую ролю ў вызваленні вострава ад фашыстаў. Шмат барацьбітоў-падпольшчыкаў загінула. Загінуў і Уладзімір Антоненка—30 красавіка 1945 года, усяго за некалькі дзён да капітуляцыі фашысцкай Германіі.

Усё, што расказана пра Уладзіміра Антоненку ў кнізе, пацвярджаюць словы французскага афіцэра, які з захапленнем гаворыць пра яго: «Здзіўляючы чалавек! Якая смеласць, знаходлівасць! Калі радавыя ў іх такія, дык ясна, што Савецкая Армія непераможная!»

Кніга «Героі Алерона» цікавая. Гэта праўдзівае і хвалюючае апавяданне яшчэ пра адну старонку гераічнай барацьбы савецкіх людзей з ворагамі.

М. САЛАЎЁЎ.

ДОБРЫ ДЭБЮТ

Малады беларускі паэт Анатоль Грачанікаў выдаў свой першы зборнік «Магістраль». Гэта кніга пра сябе, пра юнацтва, пра радасць жыцця, пра сённяшні дзень.

Не ў пашане цяпер гармонікі,
Іх пакінуў настрой вясёлы.
Вечарамі на падаконнікі
Узнімаюцца радыёлы.

Прачытаў я гэтыя радкі—і падумалася: «Як гэта проста, праўдзіва і хораша сказана, быццам пра нас, пра нашу вёску». Чытаю другія вершы—і ў іх такая ж блізкасць, такая ж цеплыня. Яны сугучны нашаму часу, а часта і напісаны па гарачых слядах падзей. І «Горны малюнак», і «Сын», і «Сябру-ракетчыку», і «Я словы для вершаў сваіх не шукаў»—хвалююць і запамінаюцца.

А вось яшчэ адзін верш, які мне асабліва спадабаўся. Гэта — «Салдацкія боты». Хочацца прывесці яго поўнасцю.

Я салдат.
На нагах маіх—боты трывалыя.
Край чужы не хачу імі мераць.
Вераць, вераць бацькі:
На апошнім прывале я
Буду дома вячэраць.
З песняй трэсне
Трэсне з песняй наўкол цішыня.
Вечар пройдзе ў развагах і
гумары...
Ну, а грымнуць баі, —
Маё сэрца ў страі,
Падавай, старшына,
Боты мне сорак трэцяга нумара!

«Магістраль» — добры, шматабяцаючы дэбют маладога аўтара.

В. ТКАЧОЎ.

в. Гута Рагачоўскага раёна.

ПЕСНЯ ПРОСТАЯ І ШЧЫРАЯ

У выдавецтве «Беларусь» выйшла кніга вершаў Святланы Яўсеевай «Новалунье». Зборнік невялікі: паэма і дзесяткі чатырох вершаў. Магчыма, літаратурныя крытыкі знойдуць у ёй недахопы, будуць гаварыць, што сёй-той з вершаў можна было напісаць лепш. Я—чытач і, можа, таму недахопаў у Яўсеевай не заўважыў. Для мяне яе вершы— песня, простая і шчырая песня сонцу і маладосці. Я гатовы разам з паэтэсай паўтараць:

Бродят где-то в небесах
Спутники земли.
Эта песня о друзьях,
Которые вдали.

Спадабалася мне і паэма «Вялікая мядзведзіца». Яна як бы дапаўняе вершы.

Я ведаю, што ў кожнага паэта свая дарога, заўсёды цяжкая і цярністая. І я веру, што на дарозе С. Яўсеевай будзе яшчэ многа добрых сустрэч з чытачамі.

А. МАРЦІНОВІЧ, студэнт.

г. Мінск.

СКАЗ ПРА БЯССТРАШНЫХ

Да нядаўняга часу мала што было вядома пра падпольную дзейнасць камсамольцаў і моладзі невялікага палескага гарадка Хойнікі. Гэты гарадок, што прытуліўся сярод лясоў і балот, у гады вайны быў адным з цэнтраў партызанскай барацьбы з акупантамі ў Гомельскай вобласці. Дзейнічала ў Хойніках і камсамольскае падполле, удзельнікі якога нанеслі нямала шкоды гітлераўцам. Пра іх — герояў падпольнага фронту, пра іх мужнасць і стойкасць напісала дакументальную аповесць гомельская журналістка А. Захарэнка. «Сказ пра бясстрашных» — так называецца гэты твор («Маладосць», № 10, 1965).

Аповесць чытаецца з цікавасцю. Аўтар расказаў трагічную праўду пра баявыя справы хойніцкіх падпольшчыкаў, не прыхарошваючы яе, не разбаўляючы вымыслам. Вось некалькі эпізодаў гэтай барацьбы.

...У будынку Рудакоўскай МТС схаваліся партызаны Н. Андросаў і А. Юшчанка. З імі была і сувязная атрада Юля Філончык. Фашысты акружылі будынак: пачаўся няроўны бой. Гітлераўцы вядуць агонь з аўтаматаў і кулямётаў. Паліцэйскія стараюцца прарвацца на другі паверх будынка. Але трое партызан адбіваюць усе атакі. Тады фашысты пачынаюць абстрэл будынка мінамётам. У бяссільнай злосці яны падпальваюць будынак, спадзяючыся, што агонь прымусіць партызан спыніць бой і здацца. Адзін за адным партызаны гінуць, але не здаюцца ворагу.

Водгаласы гэтага няроўнага бою пракаціліся па ўсім раёне. Чулі гром бою і ў Хойніках. Гібель партызан узрушыла маладых патрыётаў.

Вакол Міхася Даўгаполава, Францу Купрэйчыка і Віктара Ерша пачалі групавацца камсамольцы і моладзь: Марыя Чэкан, Ганна Лаўрусенка, Юля Купрэйчык, Юліян Тышкевіч, Марыя Сакалова і многія іншыя.

І маладыя патрыёты аднадушна вырашаюць — дзейнічаць! Да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі яны напісалі сваю першую лістоўку і расклеілі яе ў клубе, на базары, на станцыі. Лістоўкі — гэта першы крок. Камсамольцы шукаюць зброю, каб пасапраўднаму змагацца з фашыстамі. Міхась Даўгаполаў і Віктар Ерш выкрадаюць у нямецкага афіцэра пістолет. Другія падпольшчыкі падпальваюць на станцыі смалакурню.

Баявую дзейнасць моладзі накіроўвае камуніст Я. І. Казачук, кіраўнік падполля. Ён абапіраецца на іх маладосць, энергію і бяссташша. А. Захарэнка паказвае, як пад кіраўніцтвам старэйшых таварышаў-камуністаў Казачука, Латышкевіча мацнеюць рады маладых патрыётаў, шырыцца іх баявая дзейнасць. Аўтар уваскрашае суровыя будні тых часоў, барацьбу маладых патрыётаў, іх непахісную рашучасць, непрымірымую нянавісць да фашыстаў.

На рахунку ў хойніцкіх падпольшчыкаў было нямала добрых спраў. Адной з важнейшых была работа па разлажэнню славацкіх часцей, мабілізаваных гітлераўцамі для барацьбы з партызанамі. Сувязь са славакамі была настолькі цесная, што маладыя падпольшчыкі перадалі ім кінафільм «Партбілет», які славакі дэманстравалі як свой трафей. Славакі ў сваю чаргу перадавалі падпольшчыкам зброю: гранаты, аўтаматы, патроны— і самі ішлі ў партызанскія атрады.

Аўтар аповесці паграшыла б супраць ісціны, калі б паказвала толькі ўсё добрае, калі б расказала толькі пра паспяхова праведзеныя аперацыі супраць фашыстаў. А. Захарэнка піша пра гібель падпольшчыкаў, пра тыя памылкі, якія навялі фашыстаў на след падпольнай арганізацыі.

Падпольшчыцы Марыя Сакалова і Марыя Чэкан па заданню партызан склалі падрабязны спіс усіх фашысцкіх паслугачоў, здраднікаў, паліцэйскіх. У выніку бестурботнасці і паслаблення пільнасці фашысцкім карнікам удалося акружыць базу атрада. Толькі дзякуючы таму, што на адным з участкаў абарону трымалі славакі, партызаны вырваліся з акружэння. Але ў рукі фашыстаў трапіў спіс, складзены Сакаловай і Чэкан. Дзяўчат арыштавалі. Пачаліся допыты, катаванні

СЯБРОЎСКІ ПОЦІСК РУК

ЦЫРК

Расказ аб праграме цырка ГДР, якая ідзе зараз на манежы Мінскага цырка, трэба было пачаць, вядома, з парада-пралога — жыццярадаснага, яркага шэсця прыгожых і моцных маладых людзей.

Але мне хочацца пачаць з нумара, які больш за ўсё спадабаўся і запомніўся. Артысты Ікарыс — выканаўцы ікарыйскіх гульняў — выступаюць у канцы першага аддзялення. Нумар гэты—традыцыйны ў цырку, але ўжо з'яўленне артыстаў прымушае звярнуць на іх увагу. Справа ў тым, што ў такіх нумарах «верхнімі» звычайна працуюць дзеці—вага ў іх невялікая і «ніжнім» лёгка трымаць іх. (У ікарыйскіх гульнях «ніжні» ляжыць на спецыяльнай падушцы, трымаючы на выцягненых нагах «верхняга»). Ікарыс—тры маладыя хлопцы і дзяўчына прыкладна аднолькавай вагі—у гэтым першы сюрпрыз нумара і першая яго складанасць. Але артысты гэта не падкрэсліваюць, іх работа вельмі лёгкая, грацыёзная, у ёй ёсць некалькі моцных, арыгінальных трукаў.

Работа Ікарыс—гэта гульня, у якой глядач зусім не заўважае напружання. І ў гэтым—вышэйшае артыстычнае майстэрства.

Гэтае майстэрства адрозніваецца і ўсю праграму гасцей, нягледзячы на тое, што сярэдні ўзрост яе ўдзельнікаў усяго дваццаць пяць гадоў.

Цудоўную дрэсіроўку коней на свабодзе дэманструе Гельмут Рудат — добра падабраны масці жывёл, вельмі свабодна і ўпэўнена трымаецца артыст. Васемнаццаць коней, падпарадкоўваючыся, здаецца, позірку дрэсіроўшчыка, кружацца ў танцы, робяць складаныя пераходы. У гэтага нумара ўражлівы фінал—усе васемнаццаць коней адначасова становяцца «на оф»—на заднія ногі, затым адзін з коней на задніх нагах праходзіць цераз увесь манеж. Толькі выдатнаму артысту па сіле стварыць такія трукі.

У другім аддзяленні Гельмут і Ірма Рудат дэманструюць вышэйшую школу верхавой язды, уносячы ў гэты класічны нумар сваю артыстычную прывабнасць і высокапрафесіянальнае майстэрства.

Смеласць, адвага, сіла і выдумка вызначаюць работу дрэсіроўшчыка львоў Вольфа Мантанга. Артыст паводзіць сябе з жывёламі ўпэўнена і свабодна, у меру падкрэсліваючы драпежны характар сваіх выхаванцаў і вельмі ярка паказваючы чалавечую ўладу над імі. Іншы раз ён пакідае абавязковую зброю дрэсіроўшчыка—палку, рызыкуе нават павярнуцца да звяроў спіною—усё гэта не дзеля таго, каб сарваць апладысменты, а па меры патрэбы, вельмі проста і натуральна.

Арыгінальны апарат для свайго паветранага нумара выкарысталі артысты Бералінас. Ён уяўляе сабою складаную канструкцыю, якая прыводзіцца ў рух матацыклам. На вяршыні мачты—гімнастычная трапеція, на якой працуюць два артысты. З трукаў, выкананых імі, вялікае ўражанне робіць віс на пятках; увогуле ўся работа вельмі дакладная і прыгожая. Гэта адносіцца і да выдатных фігур артыстаў, і да выконваемых імі трукаў.

Багаты цікавымі трукамі і нумар акрабатаў з падкідной дошкай Тарнадас. Адзін з артыстаў, напрыклад, выконвае трайное заднее сальта; другі робіць сальта на калону з трох чалавек.

У выдатным тэмпе працуюць каскадзёры — эксцэнтрыкі Харцініс, жанглёр Фрэдзі Атэнас і скакуны на батудзе Крыстэліс. У нумары гімнастаў на падвесным першы Швенк у першую чаргу хочацца адзначыць маланкавыя вярчэнні ў зубніку. Цудоўным пачуццём балансу здзіўляюць эквілібрысты на шарах Балтос. Цікава ўвялі ў свой нумар эксцэнтрыку і акрабатыку выканаўцы тэмпавага музычнага нумара Хайдэрс. Палёт у партэры артыстаў Эстароліс—вясёлы (адзін з іх — нядрэнны комік) і ў той жа час мужны нумар.

Расказаць пра ўсё гэта, паверце, вельмі цяжка. Словы бываюць бяссільныя, калі трэба гаварыць пра феерверк майстэрства. Гэта трэба бачыць.

Шмат гадоў назад славуты рускі клоун Л. Дураў гаварыў, што «нямецкія клоуны вастрасловяць нагамі», маючы на ўвазе незлічоныя штуршкі і аплявухі, якімі яны асыпалі адзін аднаго, спрабуючы рассмяшыць гледачоў. Тады, зрэшты, гэта было характэрна не толькі для нямецкіх клоунаў.

Гэта сцвярджэнне начыста абвергнута сёння нашымі гасцямі. У праграме дзве пары клоунаў—Юле і Бубі—дывановыя, Бепо і Ота—яны выступаюць у класічным стылі. І тыя, і другія — вясёлыя, спрытныя, разумныя і тактоўныя людзі, якія маюць у сваім рэпертуары побач з традыцыйнымі цыркавымі «антрэ» сучасныя жарты і рэпрызы. Нельга не сказаць тут і пра цяжкасць, якую з поспехам пераадолелі нашы госці,—праграму яны вядуць на рускай мове. І гэта таксама не можа не выклікаць павагі да іх.

У тым, што праграма ідзе ў выдатным тэмпе, безумоўна, вялікая заслуга яе рэжысёра Чарлі Адольфа і дырыжора Пауля Хайнрыха.

Адкрываючы гастролі ў Мінску, мастацкі кіраўнік нямецкага цырка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ГДР Марыо Тура сказаў:

— Мы просім разглядаць нашы гастролі як сяброўскі поціск рук паміж Савецкім Саюзам і ГДР.

У ГДР цяпер выступаюць артысты савецкага цырка—поціск рук сапраўды атрымаўся сяброўскі, моцны і запамінальны.

Д. РАДЗІНСКІ.



Так, у 1384 годзе пасля працяглай асады і штурму напаўразбураны крэпасцю авалодалі псы-рыцары. Праз дзесяць гадоў — у 1394 годзе крыжаносцы зноў напалі на крэпасць. На гэты раз шчасце было на баку яе абаронцаў, вораг быў адбіты. Але абарончыя ўмацаванні зноў-такі значна пацярпелі.

У 1434 годзе, у час міжусобнай вайны паміж літоўскімі князямі, князь Свідрыгайла спаліў горад, які знаходзіўся ў сярэдзіне крэпасці, але цытадэль узяць не змог.

У 1505 — 1506 гадах Ліда падверглася жорсткім набегам татара-мангольскіх орд Койдана.

У час Паўночнай вайны са шведамі ў 1710 годзе яна была разбурана ханчатнова. Пасля гэтага абарончыя збудаванні Лідскай крэпасці не аднаўляліся. Мураваныя пабудовы ў сярэдзіне яе захаваліся да канца XVIII стагоддзя.

Вежы цалкам разбураны былі ў першую сусветную вайну. Тады ж абрушылася частка крэпасных сцен.

Крэпасць у Лідзе істотна адрозніваецца ад іншых абарончых збудаванняў Беларусі—такіх, як Гродзенскі, Краўскі, Навагрудскі, Мірскі і іншыя замкі. Адрозненне гэта не толькі вонкавае—кампазіцыя, архітэктурнае аблічча, канструктыўныя рашэнні і г. д., але і ўнутранае. Калі названыя замкі будаваліся як умацаваныя рэзідэнцыі магнатаў, дык Лідскай крэпасці з самага дня яе заснавання адводзілася роля пагранічнага фарпоста. У ёй знаходзіўся ваенны гарнізон, а ў выпадку патрэбы за яе сценамі знаходзіла прытулак і навакольнае насельніцтва.

Адсюль і прастата, лаканічнасць форм, адсутнасць усялякіх элементаў упрыгожвальніцтва — неабходнага атрыбута ўсіх грунтоўных збудаванняў сярэдніх вякоў.

Крэпасць у Лідзе пабудавана на штучным пагорку вышынёю каля васьмі метраў. Падножжа яго апяразвалася ровам, затопленым вадою, цераз які быў перакінены мост ля адзіных варот.

Сцены цытадэлі ўтвараюць у плане амаль правільны квадрат з бакамі каля 72 метраў. У двух процілеглых кутках (паўночна-заходнім і паўднёва-ўсходнім) узвышаліся вежы. Яны цалкам разбураны і сёння цяжка меркаваць аб іх архітэктуры і аб фартыфікацыйных прыстасаваннях.

Таўшчыня сцен крэпасці ля асновы даходзіць да чатырох метраў. Вышыня, якая раней дасягала дванаццаці метраў, сёння вагаецца ад васьмі да адзінаццаці метраў. Прыкладна на дзве трэці вышыні сцены выкладзены з натуральнага каменя з пластамі цэглы. Верх сцен і акаймаванне праёмаў—цалкам цагляныя.

Да часу пабудовы Лідскай крэпасці ў абаронным дойлідстве склаліся пэўныя традыцыі. Так, усе крэпасці ў плане ўяўлялі замкнёны многавугольнік, утвораны крэпаснымі сценамі, з вежамі на вуглах. Асноўную абаронную ролю адыгрывалі вежы, у яніх было не менш трох ярусаў баёў (падэшвены, сярэдні і верхні). Другарадную ролю адыгрывалі крэпасныя сцены, якія маюць, як правіла, толькі адзін верхні бой (пляцоўка, якая праходзіць па верху сцяны). У Лідскай крэпасці ёсць некаторае адхіленне ад гэтай традыцыі. Тут асноўную абарончую ролю будаўнік усклаў на сцены. Вежы ж (іх толькі дзве) выконвалі дапаможную ролю. Яны былі менш трывалыя, мелі больш тонкія сцены, чым і тлумачыцца іх поўнае разбурэнне.

Другім адрозненнем Лідскай крэпасці ад іншых аналагічных пабудоў гэтага часу з'яўляецца прыстасаванне завяршаючай часткі сцен. Усе вядомыя абарончыя збудаванні гэтага часу—замкі, крэпасці, крамлі, манастыры—мелі сцены, завершаныя зубцамі, за якімі знаходзіліся пляцоўкі верхняга бою. У Лідскай крэпасці зубцоў не было. Баявая пляцоўка, якая праходзіць па верху сцяны, прыкрывалася з напольнага (знадворнага) боку больш тонкай (0,7 м) цаглянай сцяной, у якой былі прарэзаны шматлікія шчылепадобныя байніцы.

Унутраная прастора крэпасці была забудавана жылымі, вытворчымі, культурнымі і іншымі збудаваннямі, пераважная большасць яніх была драўляная.

Такое рэзкае размежаванне пабудоў па функцыях — характэрная рыса рускай архітэктуры XII—XVII стагоддзяў. І зусім натуральна, што ніеўскія майстры, якія будавалі крэпасць, паследавалі гэтай традыцыі.

А. МІЦЯНІН,
кандыдат архітэктуры.

Фота Я. ПЯТАКІНА.

Помнікі нашага краю

ЛІДСКАЯ КРЭПАСЦЬ

Хто бываў у Лідзе хоць адзін раз, той, відаць, звяртаў увагу на велічэзныя руіны сярэдневяковай крэпасці ў цэнтры горада.

Крэпасць у цэнтры горада. Але не заўсёды было так. З моманту заснавання і да канца XVI стагоддзя горад увесь размяшчаўся ў сярэдзіне крэпасці.

Крэпасць пабудавана Вялікім князем Літоўскім Гедымінам у 1323—1325 гадах і прызначалася для абароны літоўскіх і беларускіх земляў ад нападу нямецкіх рыцарскіх ордэнаў. Будавалі яе лепшыя валыняні. Кіравалі работамі майстры з Кіева.

На працягу стагоддзяў Лідская крэпасць шмат разоў падвяргалася нападам, асадам, штурмам, якія неслі з сабою вялікія разбурэнні. За кожным разбурэннем следаваў рамонт, крэпасць аднаўлялася.

ГУЧЫЦЬ ГОЛАС БАГРЫЦКАГА

Унікальны запіс голасу выдатнага савецкага паэта Эдуарда Багрыцкага прынесла ў Дзяржаўны музей А. С. Пушкіна ўдава паэта Лідзія Густаваўна Багрыцкая. Праслухоўваннем гэтага запісу адкрыўся ў музеі вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння паэта. Багрыцкі быццам сам прысутнічаў на вечары. У яго выкананні літаратуразнаўцы і прадстаўнікі грамадскасці Масквы пачулі «Чатыры ветры», урывак з лібрэта оперы «Дума пра Апанаса», вершы Аляксандра Блока «Крокі камандора», якія любіў Багрыцкі.

Запіс у свой час быў зроблен настольні ўдала, што прысутным здавалася: у зале гучыць голас жывога паэта, які знаходзіцца сярод іх — мужны, звонкі, напеўны.

АДН.

ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Савецкі Саюз—краіна старажытнай і багатай культуры. У кожнай рэспубліцы помнікі мінулага адрозніваюцца нацыянальнай своеасаблівасцю і каларытам.

Пры навукова-метадычным савеце па ахове помнікаў культуры Міністэрства культуры СССР створана секцыя прапаганды і турызму. Для замежных і савецкіх турыстаў мяркуецца адкрыць гасцініцы ля архітэктурных помнікаў, а ў некаторых выпадках—там, дзе гэта не парушае правілаў захавання старажытных будынкаў, — абсталяваць гасцініцы і ў іх саміх.

За апошнія два—тры гады розныя савецкія выдавецтвы надрукавалі больш за трыста назваў даведнікаў, буклетаў, пуцевадзіцеляў. Выдавецтва «Советский художник» збіраецца ў бліжэйшы час выпусціць 30 мільёнаў экземпляраў паштовак і альбомаў, а нядаўна створаная рэдакцыя выяўленчай прадукцыі пры выдавецтве «Россия» прапанавала каля тысячы сюжэтаў для камплектаў паштовак і іншых выданняў з відамі старажытных рускіх гарадоў: Яраслаўля, Растова, Кліна, а таксама Салавецкіх астравоў, Кіжаў, возера Байкал.

Усесаюзная кніжная палата падрыхтавала дадатковую бібліяграфію для прапагандыстаў, якія чытаюць лекцыі ў клубах, установах, на турысцкіх базах.

У СССР дзейнічаюць 95 стацыянарных баз для савецкіх турыстаў. Цэнтральны савет па турызму намячае ў бліжэйшыя гады пабудаваць яшчэ трыста.

Ляніна КАЙБЫШАВА,
карэспандэнт АДН.

Куток калекцыянера

САВЕЦКІ МЕТРАПАЛІТЭН

Серыя марак, прысвечаных метрапалітэну, выпускаліся з 1935 года некалькі разоў. А цяпер метрапалітэн маюць ужо Ленінград і Кіеў. Таму новая серыя марак, выпушчаная Міністэрствам сувязі СССР, прысвечана ўжо станцыям метро трох гарадоў Савецкага Саюза. На дзвюх марках — маскоўскія станцыі «Ленінскі праспект» і «Кастрычніцкая». На трэцяй — станцыя метро Ленінграда «Маскоўскія вароты», на чацвёртай — станцыя Кіеўскага метрапалітэна — «Завод Бальшавік». Маркі выкананы паводле малюнкаў мастака Сяргея Паманскага, які і раней афармляў маркі, прысвечаныя метрапалітэну.

У Лынтупскай сярэдняй школе Пастаўскага раёна створаны школьны музей. У ім сабрана каля 300 розных экспанатаў, якія расказваюць пра мінулае раёна, пра ўдзельнікаў партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра сённяшні дзень працоўных горада і вёскі.

Фота Г. УСЛАМАВА. (БЕЛТА).

І СУР'ЁЗНА, І ВЕСЕЛА

НАТАТКІ АБ КАМЕДЫЙНЫМ ЖАНРЫ Ў КІНО

Хто з нас не любіць камедыю? Таму кожны новы фільм, які абяцае весялосць і смех, чакаецца з вялікай нецярплівасцю. Праўда, не заўсёды спадзяванні гледачоў апраўдваюцца, і слова «камедыя» не з'яўляецца, вядома, поўнай гарантыяй таго, што на экране разгорнецца цікавае і смешнае відовішча. Давайце паглядзім, што за апошні час можна запісаць у камедыйны «актыў», якія тут былі ўдачы, чым яны каштоўныя і павучальныя.

Думаю, не выпадкова сёння ў нас вакол праблемы кінакамедыі ідуць абмеркаванні і спрэчкі. Яны не маглі ўзнікнуць на пустым месцы— з'явіліся камедыйныя фільмы, якія даюць повад для размоў, цікавыя для крытычнага аналізу, адыгрываюць пэўную ролю ў далейшым развіцці жанру. І, галоўнае, з'явіліся розныя камедыі — пошукі і эксперыменты адбываюцца ў самых розных напрамках.

Быў некалькі гадоў назад такі фільм — «Пёс Барбос». Тры сябрукі, сабраўшыся глушыць рыбу, падрыхтавалі дынамітную шашку. І раптам любімы сабака — пёс Барбос, не падазраючы аб пагражаючай небяспецы, схапіў гэтую самую шашку і пацягнуў да сваіх гаспадароў. Гаспадары—браканьеры, зразумела, кінуліся наўцёкі, пёс за імі, словам, на экране адзін за адным ішлі камічныя трукі, выкліканыя пагоняю, і зала залівалася ад нястрымнага рогату.

Гэтую маленькую камедыю зняў Леанід Гайдай. Ён звярнуўся да жанру, традыцыі якога нібы былі забыты ў той час у нашым кінематографе — ва ўсякім разе стужак шчыра эксцэнтрычных мы не сустракалі. Першая спроба ўдалася, за ёю паследавала другая, трэцяя... І вось сёння з поспехам ідзе новая камедыя Гайдая, створаная ім у садружнасці з пісьменнікамі Якавам Касцюкоўскім і Марысам Слабадскім — «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка».

Што ж прадвызначыла поспех гэтага фільма? Бадай, у першую чаргу — дакладнае следаванне законам выбранага жанру, імкненне выкарыстаць усе яго магчымасці, усе «прадпасылкі», каб выклікаць у глядзельнай зале смех. Аўтары карціны верныя эксцэнтрычнай манеры, яны не баяцца перабольшваннЯ, уласцівых камедыйнаму гратэску, і, як правіла, трапна б'юць у цэль.

Пры гэтым эксцэнтрыка не перашкаджае ім выбраць дастатковa сур'ёзную мішэнь. Скажам, першая навела фільма «Напарнік» (а іх у карціне тры) накіравана супраць хуліганства і хамства, супраць парушальнікаў грамадскага спакою, якія атручваюць жыццё тым, хто жыве навокал іх. Герой навелы — вялізны здаравяк з калматай чупрынай, разлічваючы на беспакаранасць, адкрыта хуліганіць. Відаць, ён прывык сутыкацца з тымі, хто не мог і не хацеў даць яму рашучы адпор. І вось гэты дзяцюк нечакана натыкаецца на перашкоду. Ды яшчэ ў асобе не якога-небудзь вартага па росту і вазе працаўніка, а вельмі шчуплага і, здавалася б, нясмелага і сарамлівага інтэлігента — студэнта Шурыка. Паядынак Шурыка (Аляксандр Дзям'яненка) і Бамбізы (Аляксей Смірноў), якія аказаліся на адной будаўнічай пляцоўцы, і складае змест навелы.

Задуманы і разыграны гэты эпізод з сапраўдным камедыйным бляскам: адзін трук змяняе другі, адзін за другім следуюць камічныя эфекты. Досыць назваць сцэну, дзе Шурык закручвае свайго ворага ў рулон з толем, або эпізод з душам, калі Бамбіза ператвараецца ў паўголага чарнаскурага папуаса. І робіцца гэта не дзеля таго, каб толькі выклікаць смех, не толькі дзеля таго, каб яшчэ і яшчэ раз здзівіць нечаканай выдумкай. Аўтарская мэта — зняславіць Бамбізу, яе і праследуюць рэжысёр і акцёры, якія іграюць з сапраўднай верай у тое, што адбываецца, з поўнай сур'ёзнасцю.

А чым больш сур'ёзныя персанажы — тым весялей у зале, паколькі ўзнікае неадпаведнасць паміж камічнай сітуацыяй і засяроджанасцю герояў, як гэта адбываецца ў навеле «Насланнё», дзе той жа Шурык і яго маладзенькая спадарожніца нічога не заўважаюць навокал, чытаючы канспект перад экзаменам, нават таго, што ён — гэта ён, а яна — гэта яна.

Усе тры навелы аб'яднаны адным героем — гэта студэнт Шурык. Ён выступае ў якасці станоўчай асобы, якая дае бой хамству, выратоўвае дзяржаўную маёмасць, заваёўвае сэрца любай дзяўчыны. Станоўчы герой камедыі! Скажам шчыра: не частыя тут удачы. Тым больш прынцыповая работа Аляксандра Дзям'яненкі і аўтараў фільма, якія не паддаліся боязі, што камедыйнасць вобраза знізіць яго станоўчае гучанне.

Выходзячы з тых жа пазіцый, думаецца, ствараў свайго героя Леанід Быкаў, рэжысёр камедыі «Зайчык» і выканаўца яе галоўнай ролі. Зайчык — гэта прозвішча тэатральнага грымёра — сапраўды вельмі смешны, калі трапляе ў недарэчныя становішчы, але гэта не перашкаджае яму заставацца чалавекам, які абараняе, можа быць, самае каштоўнае — чалавечую годнасць.

У тых сцэнах, дзе аўтары карціны пазбягаюць проста лінейных рашэнняў, дзе тэма раскрываецца сапраўды па-мастацку і востра, фільм набывае сілу сатырычнага ўдару. Асабліва там, дзе адбываецца сутычка Зайчыка і Шабашнікава, кіраўніка ўпраўлення добраўпарадкавання.

Рознымі сродкамі можна ствараць сатырычны вобраз. Артыст Гарбачоў знайшоў вось такія — мяккія, не крыклівыя, не рэзкія для вока фарбы і з іх дапамогаю напісаў вельмі выразны партрэт свайго героя. А вось акцёр Яўгеній Еўсцігнееў у добрым фільме «Сардэчна запрашаем» (тыя, хто глядзеў гэту камедыю. напэўна памятаюць начальніка піянерскага лагера Дыніна) скарыстоўвае і гратэскавыя прыёмы, раскрываючы фармалістычную сутнасць свайго героя, але ад гэтага характар зусім не губляе сваёй рэалістычнай праўдзівасці.

Кінакамедыя можа выкрываць недахопы, знішчаць заганы. Але ў яе сілах і раскрыць прыгожае, чалавечнае. Напэўна, з гэтай мэтай паставіў сваё кароткаметражнае «Вяселле» грузінскі рэжысёр Міхаіл Кабахідзе — фільм, які адразу атрымаў прызнанне і ў нашай краіне, і за рубяжом. На працягу дваццаці мінут апавядаецца гісторыя кахання маладога фармацэўта да дзяўчыны-скрыпачкі. Але не развіццё падзей, не іх нечаканыя павароты (хоць і тут праявілася аўтарская вынаходлівасць) займаюць пастаноўшчыка — яго цікавіць чалавек, яго натура, характар.

У «Вяселлі» адраджаецца жанр «нямой камічнай карціны»: героі фільма не вымаўляюць ні слова—аб змесце іх гаворкі мы павінны здагадвацца па міміцы, жэстах... Зразумець тыя ці іншыя пачуцці памагае музыка, удала падабраная аўтарам карціны. Яркая рэжысура, выдатная ігра акцёра Гогі Каўтарадзе, які паказаў свайго героя і кранальным, і трошкі смешным, паставілі гэтую маленькую камедыю побач з лепшымі дасягненнямі жанру...

У нас на экранах нядаўна паявіліся карціны «Звычайны цуд» па казцы Яўгенія Шварца, «Жаніцьба Бальзамінава» (па п'есах Астроўскага), сучасная лірычная камедыя «Зялёны агеньчык», блізіцца выпуск фільма «Лебедзеў супраць Лебедзева», цікавага па задуме і важнага па думцы. Знаходзяцца ў вытворчасці яшчэ дзесяць новых камедыйных твораў.

Значыць, ёсць рэальныя падставы гаварыць пра ўдачы, а тым больш пра пэўнае ажыўленне ў галіне кінакамедыі.

Ніна ІГНАЦЬЕВА,
кінакрытык.
(АДН).

ЗАГАДКА «ПЯЧОРЫ ЗМЕЙ»

З поўначы, дзе над старажытным кіргізскім горадам Ош навісла седлападобная Сулейман-гара, уздоўж дарогі на раённы цэнтр Араван цягнуцца грады вапняковых уцёсаў. У іх відаць уваходы ў пячоры. Аднак пранікнуць у гэтыя пячоры ў нашы дні амаль немагчыма. Дарогу перагарадзілі абвалы.

Але адна з іх, названая мясцовымі жыхарамі «Пячорай змей», даступная для даследавання. Яна прыцягвае ўвагу многіх археолагаў-аматараў і турыстаў. Над уваходам нядрэнна захавалася вялікае пано са складаных наскальных малюнкаў. Яны займаюць каля трох квадратных метраў. Частка малюнкаў, выкананых на скале перад уваходам у пячору, утварае піктаграмы.

Сярод малюнкаў асабліва цікавы лятучы крылаты змей з наўмысна павялічанай галавой, адкрытай пашчай. Вывяргаючы полымя, ён кідаецца на маленькі кружок (Месяц). Вось ён разгрыз яго (утварылася дзве фазы Месяца) і, поўны радасці перамогі, працягвае палёт. На другім канцы пано таксама намалявана змяя, знаёмая ўжо многім археолагам па такіх піктаграмах, выяўленых у ваколіцах Оша.

Што азначаюць гэтыя змеі ў малюнкавым пісьме старажытных жыхароў Кіргізіі?

— Справа ў тым,— расказаў карэспандэнту АДН ошскі археолаг Уладзімір Чайлытка. — што такія малюнкі ў наскальным жывапісу Паўднёвай Кіргізіі сталі вядомы археолагам зусім нядаўна. Аднак яны захаваліся ў народнай творчасці суседніх з кіргізамі таджыкаў. Змеі ўпрыгожвалі вышыўкі (сюзані), ювелірныя вырабы Ура-Цюбэ, разьбу па дрэву на помніках IX—X стагоддзяў у даліне Зераўшана. У быце таджыкаў і ўзбекаў захаваўся амаль да дваццатага стагоддзя культ «хатніх» змей. Напрыклад, сярод мясцовых шаўкаводаў доўга трымаліся забабоны, быццам свая, «хатняя» змяя, калі яе даглядаць, паіць малаком... садзейнічае пемнажэнню коканаў шаўкапрада. Значыць, змяя выступае ў якасці заступніка жылля, сельскіх работ.

Ад гэтых суседніх народаў культ змей, відаць, і перадаваўся продкам паўднёвых кіргізаў. Што датычыць пано, то, напэўна, для старажытных людзей яно мела магічнае значэнне, ахоўвала ўваход у пячору.

З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

Славамір Мрожэк ЛІФТ

Выклікаў нас старшыня арцелі і кажа:

— Грамадзяне, важнае паведамленне: у нас будзе ліфт!

Мы спачатку крыху здзівіліся, паколькі будынак у нас аднапавярховы.

— Нічога не зробіш,— запярэчыў старшыня. — Мадэрнізацыя. Мы не можам ухіляцца. Якраз дзеля гэтага я вас і выклікаў. Давайце разам падумаем, як выканаць гэтую задачу.

Думалі мы, раіліся, нарэшце прыйшлі да выводу — выхад адзін: садзіцца ў ліфт у падвале, а выходзіць на гарышчы. Праўда, давядзецца па лесвіцы нямала тупаць, але ўсім нам для здароўя прагуляцца не шкодзіць. Другога выйсця не было.

Прыехалі рабочыя і ўстанавілі ліфт.

Прынялі мы на працу двух ліфцёраў. Адзін ездзіў, а другі на першым паверсе дзяжурыў, каб ніхто не парушаў парадку: ішлі на гарышча і ехалі ў падвал, а пасля ўзыходзілі на першы паверх, або ішлі ў падвал, ехалі на гарышча і сыходзілі на першы паверх. У залежнасці, каму што патрабавалася: увайсці ці выйсці.

Усё было добра, пакуль не з'явілася распаражэнне: у мэтах эканоміі ліфтам дазваляецца ездзіць толькі наверх, а ўніз ісці пеша. У сувязі з гэтым ўзніклі некаторыя ўскладненні. Цяпер, калі хто хоча выйсці з памяшкання, павінен быў, як і раней, узняцца на гарышча, пасля сысці, зноў-такі ножкамі, у падвал, а адтуль ужо нармальна, на першы паверх і да выхаду.

Але і гэта, відаць, перагружала ліфт. А паколькі да грамадскай маёмасці трэба адносіцца беражліва, распараджэнне было дапоўнена новым параграфам: ліфтам могуць карыстацца толькі начальнікі аддзелаў, цяжарныя жанчыны і ардэнаносцы (ад бронзавага крыжа і вышэй).

Так няўдала атрымалася, што ні адна з нашых супрацоўніц не падыходзіла пад параграф і старшыня звярнуўся да іх з гарачым заклікам. Ардэнаносцаў таксама не было. Быў, праўда, адзін інвалід, бухгалтар, але ён утаіў свой статус. Прыйшлося самому старшыні ездзіць.

Спакой усталяваўся толькі, калі ліфт сапсаваўся.

Горш за ўсё тое, што па-ранейшаму даводзіцца хадзіць па лесвіцах. Адступаць — гонар не дазваляе.

Пераклад з польскай.

З ГЛЫБІНЬ ВЯКОЎ

У музейных зборах амаль цалкам адсутнічаюць узоры рускага свецкага адзення XVI стагоддзя.

Калі вясною 1963 года ў Архангельскім саборы Маскоўскага Крамля былі раскрыты захаванні Івана Грознага, яго сыноў Фёдара і Івана, а таксама героя вызваленчай вайны пачатку XVII стагоддзя Міхаіла Скопіна-Шуйскага, вучоныя вельмі спадзяваліся, што калекцыя музеяў Маскоўскага Крамля ўзбагаціцца новымі ўзорамі.

Пры раскрыцці грабніцы Івана Грознага аказалася, што ён быў пахаваны ў схіме — манашескім адзенні ад якога амаль нічога не захавалася. У саркафагах цара Фёдара, царэвіча Івана Іванавіча і Міхаіла Скопіна-Шуйскага астанні загорнуты ў шаўковую тканіну чырвона-карычневага колеру, перавязаную шнурам. Цяпер пад дзеяннем дзённага святла гэтая тканіна набыла цёмнабурае адценне. Рэшткі адзення — невялікія вельмі забруджаныя шматкі — асцярожна вымалі з пахавання. Але яны развальваліся ў руках, ператвараючыся ў груду сухіх ломкіх валокнаў. Захаваліся толькі нагрудныя і наплечныя ўпрыгожанні, ластавіцы, цягі-швы, зверху якіх прышывалася прыгожая тасьма.

Гэтыя фрагменты тканін паступілі ў рэстаўрацыйную майстэрню музеяў Маскоўскага Крамля. Рэстаўратары Марыя Бакланава, Таміла Кашлякова і Надзежда Іванова па захаваных напаўсатлелых шматках пахавальнага адзення вырашылі аднавіць іх першапачатковы выгляд.

Перш за ўсё неабходна было ачысціць тканіну ад бруду, арганічных злучэнняў, вапнавых напластаванняў. Дзеля гэтага іх змяшчалі на чарзе ў ванны з рознымі хімічнымі саставамі і змяшчальным растворам дыстыляванай вады і гліцэрыну. Старанна прамытую тканіну асцярожна распраўлялі пэндзлікам і прасушвалі.

Калі прасушаныя і ачышчаныя фрагменты тканіны былі раскладзены на стале, узнікла пытанне: а як жа сарочкі былі пашытыя? Па захаваных цягах рэстаўратарам удалося скласці чарцяжы сарочак. Яны аказаліся аднатыпнымі. У XVI стагоддзі раскрою адзення яшчэ не ведалі. Палотнішча тканіны раздзіралі ўздоўж папалам, і абедзве палавіны прышывалі да цэнтральнага палотнішча, утвараючы бакі сарочкі. Паміж сярэдзінай і бакавым палотнішчамі ўстаўлялі спераду і ззаду кліны.

Затым з'явілася другая праблема — з якой тканіны былі зроблены сарочкі? Бо захаваліся толькі навалачні тафты, якая мела першапачатковa чырвоны колер. Мантаж сарочкі паказаў, што тафта прымянялася толькі дзеля аздаблення, з яе рабілі канты, якія ўпрыгожвалі адзенне, на яе нашывалі нагрудныя і наплечныя ўпрыгожанні. Сама сарочка была пашыта з тканіны, якая разбурылася куды хутчэй, чым тафта. Мяркуюць, што сатлелая, незахаваная частка адзення была светлай, як і сарочка царэвіча Дзмітрыя, што захоўваецца ў зборы музеяў Маскоўскага Крамля. Рэстаўратары падабралі белую шаўковую тканіну і пафарбавалі яе ў адвары карэнняў цыкорыя з невялікім дадаткам анілінавых фарбавальнікаў. Тканіна набыла крэмаватае адценне. Відаць, сарочкі былі пашыты з такога светлага натуральнага палатна.

...І вось рэстаўрацыя закончана. Перад намі адзенне ў тым выглядзе, у якім яно было тры стагоддзі назад. Сарочкі Фёдара і Івана Іванавіча здаюцца простымі і сціплымі для прадстаўнікоў царствуючага дома. Іх нагрудныя ўпрыгожанні, а таксама ўпрыгожанні на падоле ў выглядзе невялікіх гарызантальных палос выкананы з сярэбранага пазалочанага дроту, навітага на шаўковую нітку. Значна прыгажэйшая сарочка Міхаіла Скопіна-Шуйскага, аздоблена цудоўнай вышыўкай. У гэтым няма нічога дзіўнага — бо Скопін-Шуйскі быў славутым палкаводцам свайго часу.

Эмілія СУХАНАВА,
навуковы супрацоўнік музеяў Маскоўскага Крамля.

Літаратура і Мастацтва 4

Пятніца, 10 снежня 1965 года

ТЭЛЕБАЧАННЕ

10 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Тры плюс два». Мастацкі фільм. 16.35 — праграма перадач. 16.40 — для дзяцей. «Прыходзь, казка». Мастацкі лялечны фільм. 17.30 — бюро кансультацый клуба «Колас». «Аплата працы ў калгасах». 17.50— тэлевізійныя навіны. 18.10 — музычны антракт. 18.20 — «Подазіг». Тэлевізійны альманах. Трансляцыя на Маскву. 19.10 — Ю. Эдліс. «Арганаўты». Спектакль Маскоўскага драматычнага тэатра (М). У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — майстры мастацкага слова. Выступае заслужаны артыст РСФСР А. Ганчарэў. 22.30 — «Па вашых просьбах». Канцэрт.

Другая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена». (М). 17.00 — для дзяцей. «Вінцік і Шпунцік — вясёлыя майстры». Мультыплікацыйны фільм (М). 17.20—«Экран вялікай хіміі» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — для веруючых і неверуючых. «Прасвятленне». Навукова-папулярны фільм. 18.50 — «Мсціўца». Тэлевізійны спектакль. 20.20 — пленум Саюза кампазітараў БССР. Сімфанічны канцэрт. 21.20 — новае ў нашай фільматэцы. «Старана пагранічная». «Батарэя, агонь!». Кінанарысы. 22.00 — вядомыя спевакі. Гаар Гаспарак (М).

11 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Мсціўца». Тэлевізійны спектакль. 15.20 — праграма перадач. 15.25 — «Другое прызванне». Дакументальны фільм. 16.05 — для малышоў. «Лясныя падарожнікі». Мультыплікацыйны фільм. 16.25 — «Сцежкаю подзвігаў». Перадача Брэсцкай студыі тэлебачання. 16.45 — для школьнікаў. «Вачыма тваіх равеснікаў». Тэлевізійная перадача. 17.10 — насустрач XXIII з'езду КПСС. Рэпартаж з радыёзавода. 17.30 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — для школьнікаў. «У дзячным тэатры». Перадача з Будапешта. 18.50 — тэлевізійны клуб кінападарожнікаў (М). 20.00 — канцэрт (М). 20.55 —літаратурны тэатр. А. Яшын. «Частую габінай» (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «На агеньчык». Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 15.10 — для школьнікаў. «Дзяўчынка, з якой я сябраваў». Мастацкі фільм (М). 16.30 — «Рускія мелодыі». Канцэрт. Перадача са Свярдлоўска. 17.00 — тэлевізійныя навіны (М). 17.10 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — па вашых просьбах. «Аптымістычная трагедыя». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 20.00 — песні і эстрадная музыка беларускіх кампазітараў. Канцэрт з пленума Саюза кампазітараў БССР.

12 снежня

Першая праграма. 10.00 — «Будзільнік